Даныя аб сучасным становішчы с.-гасп. каапэрацыі, якія здабыты пры абсьледваньні, паказваюць, што расьце лік каапэраваных гаспадарак, павялічваецца колькасьць аб'ядноўваемага ёй насельніцтва, растуць размеры таваразвароту і г. д. Некалькі прыкладаў: на 1-X—25 г. с.-гасп. каапэрацыя складалася з 804 каапэр. аб'яднаньняў, якія ахоплівалі 122.200 гаспадарак,—на 1-X—26 г. лік гаспадарак павялічыўся да 188.200 гасп. (27,5% гасп. БССР). Таваразварот павялічыўся ў 2½ разы, і г. д.

Аднак-жа побач з паказаным колькасным ростам, якасныя посьпехі нязначны.

Абсьледваньнем было адзначана, што ня гледзячы на атрыманую ўрадавую доўгатэрміновую пазыку 340.000 руб. у перыяд з 1-I па 1-IV—27 г., грашовае становішча Акрсельсаюзаў і Белсельсаюзу застаецца напружаным. Зводны баланс па 8 акруговым саюзам на 1-X—26 г. у параўнаньні з 24-25 г. зьменшыўся на 26%. Уласныя сродкі зьменшыліся на 0,5% баляңсу, у імабільных актывах ня толькі ўласныя сродкі, але і 431.000 тысяча руб. доўгатэрміновых пазык. Па БСС свае сродкі зьменшыліся на 5,9%, на гэты процант павялічылася роля пазыковых сродкаў.

Асноўнымі прычынамі гэтага зьяўляюцца:

1) узьніканьне шэрагу саюзаў на базе нездаровай і няўстойлівай і пры адсутнасьці сродкаў (Слуцак меў пры арганізацыі 11 руб., Бабруйск 111 р. і г. д.).

2) адсутнасьць належнага вучоту эканамічных умоў пры арганізацыі нізоўкі

3) цяжкія ўмовы для с.-гасп. каапэрацыі пры заключэньні гэндагавораў з дзяржпрамысловасьцю (навязваньне няходкіх і несэзонных тавараў, невыкананьне заказаў і інш.).

Арганізацыйнае абслугоўваньне было вельмі невыстарчальным, інструктары ў акругах зьяўляліся не арганізатарамі, а тэхнічнымі рэвізорамі; у некаторых акругах (Ворша) рэвізыя працягваліся да аднаго году (акт 130 аркушаў). Апарат с.-гасп. кааперацыі разтуты, па 137 крэдытным таварыствам за 1-е паўгодзьдзе 1927 году кошт апошняга роўны 183 000 р. ці 24% да выдатку па усёй сетцы. Нагрузка апарату па нізоўцы нязначна, што і наглядаецца па Акрсельсаюзам.

НКРСІ прапанавана шэраг мерапрыемстваў для аздараўленьня с.-гасп. кааперацыі.

Прапанавана перагледзець сетку з мэтай ліквідацыі нерэнтабельных прадпрыемстваў с.-гасп. тавырыстваў і крэдытных таварыстваў, а таксама скараціць штаты Акрсельсаюзаў да 23 чал. замест 30-35 ч., БСС 52 замест 65 і распрацаваць штаты нізавой сеткі, узгадніўшы з НКРСІ.

Абсьледваньне калектыўных гаспадарак

Калгасы Беларусі паступова будаваліся на развалінах, у большасьці выпадкаў, зруйнованых окупантамі маемасьціх абшарнікаў, пасэлкамі і вясковай беднатой, якія пачалі гаспадарыць з мінімальнай колькасьцю сродкаў і прылад вытворчасьці і пры адсутнасьці належных культурных ведаў і спосабаў.

Маючы цяпер значныя дасягненьні у галіне гаспадарчых накапленьняў, калгасы у сучасны момант усё яшчэ надта бедны асноўнымі і абаротнымі сродкамі, асабліва будынкамі і прадукцыйнай жывелай. Але горш за ўсё пытаньне арганізацыі гаспадаркі і унутранага распарадку. *Уключаныя у сыстэму с.-гасп. кааперацыі, калгасы не карысталіся з боку апошняй амаль што ніякім арганізацыйна гаспадарчым абслугоўваньнем* а самім ніяк ня можна было спр.віцца з арганізацыяй буйнай гаспадаркі і прытым калектыўнай, якая выяуляла сабой гаспадарку ўусім новага і вельмі складанага тыпу. Момантамі, якія тармазілі гаспадарчае разьвіцьце калгасу, былі таксама прызнаны і дагаворныя ўмовы з НКЗ, на падставе якіх калгасы карысталіся дзяржмаемасьцю пры састаўленьні на іх тэрыторыі шмат якіх тэхнічных прадпрыемстваў у карыстаньні розных ведамстваў, што ставарала некалькі гаспадарачых суб'ектаў на адной сядзібе. Прыкмячаліся няспрыяючыя адносіны да калгасаў з боку некаторых мясцовых зямельных работнікаў і маламагутнасьць некаторых гаспадарак, якая часта штурхае на шлях індывідуалізацыі. Культурнае становішча калгасаў таксама кепскае. Слаба з агракультурным абслугоўваньнем вескі; у гэтай справе неабходны таксама кіраўніцтва і ўказаньні з боку.

У выніку абсьледваньня калегіяй НКРСІ было прызнана неабходным правядзеньне цэлага шэрагу мерапрыемстваў, якія маюць на мэце зьнішчыць выяўленыя дэфэкты і садзейнічаць замацаваньню і далейшаму росту і разьвіццю сеткі калгасаў. У прыватнасьці, пастаноўлена арганізаваць пры Белсельсаюзе сэкцыю калгасаў (якая ужо функцыянірує), перадаць калгасам дарэмна знаходзячыяся ў іх карыстаньні дзяржмаемасьць і тэхнічныя прадпрыемствы на іх тэрыторыі, у чым-бы веданьні яны не знаходзіліся; скончыць у 1927 г. земляўпарадкаваньне калгасаў з аднясеньнем выдаткаў на кошт дзяржбюджэту, параўнаць калгасы з бядняцкім насельніцтвам у адносінах да льгот па карыстаньню дзяржлесфондам і з зямельнымі вобчаствамі у правох карыстаньня лясамі мясцовага значэньня; зьвярнуць асаблівую ўвагу на індустрыялізацыю калгасаў і замацаваньне сувязі з сыстэмай с.-гасп. кааперацыі; узмацніць культурна-асьветную працу ў калгасах, усямерна дапамагаць арганізацыі новых калгасаў і шмат іншае.

Выкананьне ўсіх гэтых дырэктыў бязумоўна ўзьніме гаспадарчы і культурны дабрабыт калгасаў і павялічыць удзельную вагу нашых сацыялістычных элемэнтаў у вёсцы.

Праца ЦКК РСІ па зьніжэньню цэн. Удзел у гэтай працы АКК і сэкцыяў гарсавету

Дырэктыва партыі і ўраду аб зьніжэньні цэн, у прыватнасьці апошняя пастанова аб зьніжэньні раздробных цэн на 1-е чэрвеня на 10%, прыцягнула асаблівую увагу ЦКК РСІ. Прэзыдыум ЦКК распрацаваў сыстэму кантролю і удзелу ў ажыцьцяўленьні гэтай важнейшай задачы працоўных мас праз крамныя камісіі і грамадзкія арганізацыі. *Не абмяжоўваючыся сталым удзелам прадстаўніка РСІ у міжведамсьцьвеннай камісіі пры НКГандлю, дзе былі вызначаны новыя накідкі на шэраг прадметаў першай неабходнасьці, а таксама граніцы налічэньняў сыстэмай спажывецкай і сельска-гаспадарчай кааперацыі*, пры дапамозе АКК-РСІ была мабілізавана ўвага мясц., таксама *масавае абсьледаваньне гораду і вёскі з боку НКГандлю было праведзена пры актыўным удзеле РСІ і сэкцый* пры *гарсаветах*. Неаднакратная праверка прэзыдыумам ЦКК ходу зьніжэньня цэн садзейнічала своечасоваму выпраўленьню маючыхся недахопаў. Аднак, хаця фармальна дырэктыва партыі выканана, але, як агульнае зьявішча, *зьніжэньне раздробных цэн дасягнута*, як за лік прыбыткаў прамысловасьці, паколькі сабекошт прам. прадукцыі ня быў зьніжаны, *гэтак і за лік накапленьня тавараправодзячай сеткі*. Апошняя значных дасягненьняў у зьніжэньні накладных выдаткаў ня мае, ня гледзячы на тое, што па ініцыятыве НКРСІ сыстэма спажывецкай кааперацыі была перабудавана, зьліквідаваны шэраг прамежных зьвеньняў (5 Акрсаюзаў).

Дасягнутае патаненьне на 9-10% бюджэтнага набору, некаторым чынам зьнішчалася шляхам падвышэньня цэн на с.-гасп. прадукты, асабліва мяса і інш., на якія цэны на рынку былі значна узьняты ў прамысловых раёнах, што паслабляла эфэкт на бюджэце рабочага. Апошні час зьвернута асаблівая увага на узмацненьне ролі кааперацыі у нарыхтоўцы с.-гасп. прадуктаў для рабочага спажыўца. Цэны зараз трымаюцца на дасягнутым узроўні, за выключэньнем сэзоннага падвышэньня на паасобныя прадукты.

Выкананьне дырэктыў аб 20% зьніжэньні адм.-гасп. выдаткаў

Рух адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў па кааперацыі

	Выдаткі ў 1926-1927	Выдаткі, мяркуемыя на 1927-28	Выдаткі за-[illegible] 1927-28
БІКА	34 271-02	18.071	[illegible] 071
БКС	569 566	457 651	[illegible] 651
МЦРК	151 835	123.069	[illegible]
Беласельсаюз	184.144	141 379	[illegible]
Беласамотужпрамсаюз	73.091	73.029	71 [illegible]
	1 012.910-02	829 289	797 972

1.012.910-02
—797 972 —
214.938-02

Сводка паказвае, што 20% зьніжэньня адміністрацыйных выдаткаў на 3 XII наогул выканана.

Балячкі ў каапэрацыі

Аб пратэкцыянізьме ў Менскім ЦРК. Прэзыдыумам ЦКК даручана было Менскай АКК-РСІ правесьці расьсьледваньне наступных заяў аб пратэкцыянізьме ў МЦРК.

Абсьледаваньнем было ўстаноўлена, што ў гандлёвых прадпрыемствах МЦРК маецца 76 чал. служачых, якія зьвязаны сваяцтвам; 19 чал. рабочых і служачых пры паступленьні былі падтрыманы „сваякамі“ служачымі МЦРК.

Па расьсьледваньні справы АКК прапанавала фракцыі ЦРК разам з фракцыяй мясцкому пры ўдзеле ячэйкі КП(б)Б адразу-ж звольніць з работы асоб, якія паступілі на службу па пратэкцыі. Пры ажыцьцяўленьні гэтай прапановы было ўказана звальняць з пасады ня толькі асоб прынятых па пратэкцыі, але і тых, хто дапусьціў пратэкцыю ці дапамагаў ёй. Пры далейшай рацыяналізацыі апарату МЦРК мець на ўвазе сваякоў і звальняць іх у першую чаргу. Адносна асоб, якія дапусьцілі пратэкцыянізм, АКК пастанавіла разглядаць пытаньне дадаткова.

Справа Бабруйскага ЦРК

Справа Бабруйскага ЦРК зьяўляецца вельмі паказальнай з боку выяўленай абсьледваньнем бязьдзейнасьці ячэйкі і парушэньняў партдырэктыў па рэжыму эканоміі і барацьбе з пратэкцыянізмам у дзейнасьці фракцыі праўленьня ЦРК.

Абсьледваньне, якое праводзілася Бабруйскай АКК, выявіла, што за мінулы год было патрачана каля 10 000 р. на камандыроўкі, у некаторых служачых камандыроўкі дасягалі звыш 100% іх зарплаты. Падсправаздачныя сумы хадзілі па некалькі год на руках; аказалася няпэўных даўгоў звыш 10 000 р., па якім праўленьне ня прымала мер да спагнаньня. Бухгальтэрыя адстала на 4 месяцы. Штат быў павялічаны і, ня гледзячы на гэта, за складаньне балянсу 25—26 г. было заплачана 1 800 р., у той час, калі некаторыя бухгальтары атрымлівалі нагрузку да 30%. Шырока практыкавалася выдача авансаў. Была выяўлена вялікая колькасьць служачых, якія знаходзіліся паміж сабою ў сваяцкіх сувязях (да 30 чал. „родзічаў“ — цэлая „родавая абшчына“). У апараце было шмат чужога элемэнту (спэкулянтаў, крамнікаў; некаторыя проста пераходзілі з сваёй крамы ў ЦРК).

Абсьледваньнем канстатавана, што „ячэйка амаль што ня прыймала ўдзелу ў гаспадарчай дзейнасьці ЦРК, ня прыняла ніякага ўдзелу ў прапрацоўцы пытаньняў рацыяналізацыі апарату, зьніжэньня раздробных цэн, скарачэньня накладных выдаткаў і ні разу ня ўзьняла пытаньне аб засьмечанасьці апарату чужым элемэнтам і аб барацьбе з пратэкцыянізмам“ (з пастановы АКК).

У выніку абсьледваньня быў зьняты з работы заг. гандлёвым аддзелам Яму, і старшыні праўленьня быў абвешчаны строгі вымавар, а рэштцы членам праўленьня было пастаўлена на від.

Ячэйцы ў цэлым абвешчана рашучае папярэджаньне, а члены бюро ячэйкі, якія мелі ў сваім распараджэньні матэр'ялы аб недахопах і кумаўстве і ня прынялі ніякіх мер да пастаноўкі пытаньня перад сходам ячэйкі ці парторганамі, аддадзены партыйнаму спагнаньню.

Пры праверцы выкананьня дырэктыў КК устаноўлена, што большая частка прапаноў АКК фракцыяй праўленьня ЦРК была ўжо выканана.

Справа Белсельсаюзу

Расьсьледваньне справы аб безгаспадарчасьці, неправедзеньні рэжыму эканоміі і момантаў пратэкцыянізму ў працы Белсельсаюзу сьцьвер-

дзіла, што ў працы праўленьня мінулага складу ня было патрэбнай узгодненасьці паміж паасобнымі членамі праўленьня, адсутнічала цьвердая лінія ў кіраваньні дзейнасьцю БСС.

У дзейнасьці праўленьня мелі мейсца моманты безгаспадарчасьці, мала ўдзялялася ўвагі захаваньню ад псаваньня с.-гасп. машын, прылад і іншай маемасьці, якая доўгі час валялася у двары праўленьня і псавалася. Другім момантам неправядзеньня рэжыму эканоміі у апараце праўленьня БСС зьяўлялася сыстэматычнае дапушчэньне звышурочных работ. Былі выяўлены выпадкі непатрэбных камандыровак, і побач з гэтым адзначан шэраг момантаў ненармальнага і несвоечасовага заб сьпячэньня таварамі Акрсельсаюзаў, што сьведчыла аб невыстарчальнай пляновасьці ў працы.

Ня было ўдзелена з боку праўленьня БСС адпаведнай увагі справе кантролю за ходам усялякага роду загатовак і пастаноўкі працы бухгальтэрыі.

Праўленьнем БСС дапушчан быў шэраг парушэньняў службовага парадку пры укамплектаваньні апарату БСС работнікамі (дапушчэньне службы сваякоў і іншыя віды пратэкцыянізму).

Па пытаньням безгаспадарчасьці і неправядзеньня рэжыму эканоміі ў Беласельсаюзе справа перададзена судовым органам.

Партыйныя члены праўленьня былі зьняты з работы і акрамя таго былі прыцягнуты да розных партспагнаньняў.

Зьвернута была сур'ёзная увага фракцыі праўленьня БСС на ўстанаўленьне належнага кантролю за ходам усякага роду загатовак і ўстанаўленьне лепшай пастаноўкі справы справаздачнасьці, усклаўшы персанальна адказнасьць за гэтую справу на аднаго з членаў праўленьня.

Пытаньне аб злоўжываньнях у справе мясных і іншых загатовак перададзена пракуратуры правядзеньня судовага сьледзтва.

Абсьледваньне скарыстаньня надзвычайных мэтавых крэдытаў

Агульная сума надзвычайных мэтавых крэдытаў, якія адпушчаны БССР у 1925—1926 г. складаюць 10 172,6 тыс. руб., з якіх па фонду гаспадарчага аднаўленьня 2.169 тыс. руб з рэзэрвнага фонду СНК і дзяржбюджэту—8 003.6 тыс. руб.

Праведзеная РСІ праверка скарыстаньня гаспадарчымі органамі БССР надзвычайных мэтавых крэдытаў выявіла, што значная частка крэдытаў скарыстана не па прызначэньню, або засталася зусім нескарыстанай.

Скарыстаньне фонду гаспадарчага аднаўленьня намячалася ў наступных трох напрамках: на індустрыялізацыю сельскай гаспадаркі 163.000 р. (7%) на пабудову халадзільніка—234.000 р. (11%) і на прамысловае будаўніцтва—1 772 000 р. (82%).

Усе сродкі на індустрыялізацыю сельскай гаспадаркі былі накіраваны праз Беласельсаюз. Аднак, Беласельсаюз ня быў падрыхтован да правядзеньня ў жыцьцё ўсіх тых мерапрыемстваў, на якія былі адпушчаны крэдыты, ня меў рэальнага пэрспэктыўнага пляну, ня ўлічыў штодзённых патрэб мейсц з прычыны чаго ня мог скарыстаць сродкаў па прызначэньню. З 163 000 р., адпушчаных на індустрыялізацыю, скарыстана па прызначэньню толькі 50.215 руб.

Беласельсаюз таксама атрымаў на арганізацыю спэцыяльных відаў с.-гасп. кооперацыі 130 тыс. руб. і на доўгатэрміновае крэдытаваньне с.-гасп. прамысловасьці 135 т. р., з якіх па першаму віду крэдытаваньня было выдадзена нізавой сетцы 48%, а па другому віду 83%. Нізавая-ж сетка ў сваю чаргу скарыстала гэтыя крэдыты не па прызначэньню.

200 т. р., якія адпушчаны Хлебапрадукту і Белкоопсаюзу на загатоўку хлебнага манэўранага фонду скарыстаны апошнімі не па прызначэньню, і хлебны фонд загатоўлен ня быў.

Значная частка крэдытаў засталася ў Вобчастве с.-гасп крэдыту, якія былі адпушчаны на землеўпарадкаваньне і мэліарацыю. Меліся некаторыя хібы ў налічэньні процантаў на выдадзеныя пазыкі; крэдыт на землеўпарадкаваньне ува многіх выпадках даведзены да пазычальніка не па 6%, а па 7%. Проценты у некаторых выпадках браліся наперад. Былі выпадкі выдачы пазык не на вытворчыя патрэбы і з парушэньнем клясавага прынцыпу.

Калегіяй НКРСІ БССР вынесен шэраг пастаноў для урэгуляваньня пытаньня аб скарыстаньні надзвычайных сродкаў. Зьмяняецца уся арганізацыйная структура мэтавага крэдытаваньня. Забараняецца разьмеркаваньне крэдытаў паміж паасобнымі таварыствамі зьверху. Пры разьмеркаваньні крэдытаў рашана забясьпечыць удзел РВК-аў праз агрысаветы Беласельбанку прапанована выдаць усе нявыдадзеныя надзвычайныя крэдыты 1925–1926 г. і забясьпечыць іх выдачу ўсеи сыстэмай с.-гасп. крэдыту не пазьней пачатку сэзону землеўпарадкаваньня і меліярацыйных работ. Усе лішне налічаныя проценты сыстэмай с.-гасп. крэдыту прапанована залічыць пазычальнікам пры першым пагашэньні пазык.

Шэраг арганізацыяў і асоб прыцягнуты да судовай, грамадзкай адміністрацыйнай адказнасьці.

Абсьледваньне загатовак скуранага сырцу спажывецк. і с. гасп. каапэрацыяй

Абсьледваньне скурна-сырцовых загатовак мела ў асноўным на мэце выявіць работу усіх загатоўчых арганізацыяў з мэтай спрашчэньня іх структуры і патаненьня іх апарату.

Агляд дзейнасьці загатоўчых арганізацыяў з пункту погляду выкананьня імі сваіх плянаў пераконвае нас у тым, што ў той час, калі буйнага сырцу было загатоўлена ў размерах блізкіх да плянавых меркаваньняў, па дробнаму сырцу мы маем недавыкананьне пляну, што тлумачыцца цэлым шэрагам момантаў, як-та: неураджаем кармавых траў у 1925–1926 г., павялічэньнем забою буйнай жывелы, які меў у выніку меншы выхад апойка, актыўнай роляй прыватніка на рынку дробнага сырцу і г. д.

Гаворачы аб ступені выкананьня пляну паасобнымі ўдзельнікамі загатоўчай кампаніі, неабходна адзначыць, што *абедзьве сыстэмы каапэрацыі (спажывецкая і с.-гасп.) выканалі свае дагаворныя абавязацельствы з боку перавышэньня па абодвым відам сырцу*. Калі да ўсяго гэтага дадаць значную ролю каапэрацыі у загатоўках скурсырцу — 39%, параўнаючы загатоўкі скурсырцу гэтага году з загатоўкамі 1925–26 г. мы павінны прыйсьці к бясспрэчнаму вываду, што каапэрацыйная сыстэма БССР вырасла ў даволі магутную сілу на рынку скурсырцу. Разам з гэтым нельга не адзначыць такі недахоп, як тое, што с. гасп. каапэрацыя, якая павінна каапэраваць раздробленую сельскую гаспадарку ў галіне арганізацыі збыту жывёлага сырцу, мае недастатковы удзел у рабоце па загатоўцы скурсырцу. Ненармальным зьяўляецца таксама становішча, калі каапэрацыйныя цэнтры БССР недаволі кіруюць загатоўчай работай аб'ядноемых імі сыстэм.

Гаворачы аб сыстэме загатоўчага апарату ВКС, неабходна ўказаць, што акруговыя агенцтвы, як рэгулюючыя ячэйкі, апраўдалі сябе ў вельмі нязначнай ступені, таму што функцыі іх зводзіліся пераважна да пытаньняў адміністраваньня. У выніку мы маем становішча, што Бел

Кантора ВКС, якая сама не зьяўляецца апарацыйна-загатоўчай арганізацыяй, была ў поўнай ступені адарвана ад рынку скурсырцу. Акрамя таго, некаторыя агэнцтвы ВКС не апраўдалі сябе і як апарацыйна-загатоўчыя ячэйкі.

Ненармальнасьці ва ўзаемаадносінах ВКС з каапэрацыяй заключаюцца, галоўным чынам, у тым, што маюцца паасобныя выпадкі, калі апарат ВКС адцягвае прыемку сырцу ад каапэрацыі, што падрывае спажывецкія саюзы магчымасьці своечасова аплачваць нязвой сетцы дастаўлены ёю сырэц. Акрамя таго, выяўлена, што ў цэлым шэрагу акруг работа загатоўцаў праходзіла ў атмосфэры нездаровай конкурэнцыі.

Накладныя выдаткі апарату ВКС (9,1%), бязумоўна, вялікія, улічваючы велічыню звароту у 2 міл. руб. Сапраўды, гэты процант павінен накольні зьменшыцца, калі прыняць пад увагу, калі некаторая доля выдаткаў падае і на абслугоўваньне каапэрацыйных загатовак.

Адсутнічаньне ў каапэрацыйных цэнтрах зьвестак аб накладных выдатках каапэрацыі па скурзагатоўках БССР прымусіла карыстацца частковымі суседпаведнымі данымі, параўнаючы якія ўсё-ж відаць, што сабекошт сырцу, загатоўленага каапэрацыйным апаратам, ніжэй у параўнаньні з сырцом, які загатоўлен апаратам ВКС.

Неабходна яшчэ падкрэсьліць адно ненармальнае зьявішча: калі у шэрагу акруг (Ворша, Бабруйск) сырэц у сваім руху да трэсту праходзіць увесь лішнія інстанцыі: склад спажывецкага саюзу—склад агэнцтва ВКС.

НКРСІ БССР у сваіх вывадах прызнаў, што у мэтах набліжаньня перыфэрыйна-загатоўчага апарату к Бел. Канторы ВКС, неабходна зьнішчыць увесь лішнія прамежныя зьвеньні у відзе акруговых агэнстваў. Такая рэарганізацыя загатоўчай сеткі ВКС, акрамя эканоміі сродкаў (40 тыс. руб.), робіць Бел. Кантору ВКС сапраўды рэгулюючым цэнтрам, цесна зьвязаным з скурсыровым рынкам. У мэтах зьнішчэньня ажыотажу і конкурэнцыі на рынку скурсырцу, прызнана немэтазгодным далейшае пашырэньне загатоўчага апарату ВКС.

Дзеля таго, каб с часам каапэрацыя стала асноўным загатоўцам скурсырцу, НКРСІ стаў на пункт погляду неабходнасьці паступовай перадачы ёй сельскіх і местачковых раёнаў, дзе забой жывёлы каапэрацыйнымі арганізацыямі па сваім памерам зьяўляецца пераважным.

Прапанова Бел. Канторы ВКС: а) удасканаліць існуючыя формы вучоту загатовак з тым, каб была магчымасьць выявіць ролю па асобных катэгорыях прыватных пастаўшчыкоў, б) сырэц накіроўваць трэсту з аднаго складу, в) прыняць усе меры ўзьдзейнічаньня на свой загатоўчы апарат з мэтай зьнішчэньня маючых месца выпадкаў жорсткага падыходу апарату ВКС да прыемкі каапэрацыйнага сырцу.

І, у рэшце, зьвернута увага каапэрацыйных цэнтраў БССР на неабходнасьць умацненьня кіраўніцтва загатоўчай працай аб'ядноўваемых імі сыстэм.

Заключэньне

Ня гледзячы на тое, што маецца яшчэ шэраг недахопаў, за апошні перыяд каапэрацыя мае бясспрэчныя дасягненьні: пераход на прынцып добраахвотнага сяброўства, на грунце якога каапэрацыя дасягнула сур'ёзных станоўчых вынікаў, апраўдаў сябе цалкам і поўнасьцю. У першыя гады савецкага будаўніцтва асноўным відам каапэрацыі ў нас была спажывецкая каапэрацыя, якая да 20 мая 1924 г. працавала на падставе дэкрэту ад 7-га красавіка 1921 году, па якому ўсе грамадзяне

павінны былі быць сябрамі ЕПО. К канцу 1923 года гаспадарчае жыцьцё краіны запатрабавала для каапэрацыі новых форм, якія і былі ўстаноўлены дэкрэтам 20-га мая 1924 году, які пашырыў задачы, вызначыў прававое становішча, паклаў прынцып добраахвотнасьці. Зараз мы маем шырока разьвінутымі усе віды каапэрацыйных форм. Каапэрацыя дае шырокую ініцыятыву кожнаму гаспадару у яго гаспадарцы і накіроувае адпаведным чынам яго гаспадарчую дзейнасьць.

У сучасны момант у першую чаргу неабходна зьвярнуць увагу на якаснае палепшаньне каапэрацыі, умацаваньне існуючай каапэрацыйнай сеткі, паглыбленьне яе працы, больш актыўнае уцягненьне каапэраванага жыхарства у працу, асабліва беднаты. Мы павінны дабівацца больш шага згуртаваньня наукол каапэрацыі *беднаты і сераднякоў*, замацаваньня у ёй кіраунічай ролі батрацтва і беднаты і ізаляцыі кулацкіх элемэнтаў. Трэба дабівацца большай каапэрацыйнай грамадзкасьці, падвышэньня самадзейнасьці пайшчыкаў, забясьпечаньня ўсебаковага абгаварэньня дзейнасьці выбарчых органаў і падбор лепшых працаўнікоў з рабочых, беднаты і найбольш правераных на грамадзкай працы серадняков. Неабходна дабівацца павялічэньня каапэраваньня і гаспадарчага абслугоўваньня беднаты.

Надта важнай задачай каапэрацыі зьяўляецца большая мабілізацыя сялянскіх сродкаў, зьмяншэньне расходаў, рацыяналізацыя усей працы, зьніжэньне цэн.

Выкананьне дырэктыў партыі, умацаваньне партыйнага кіраўніцтва у каапэрацыі, замацаваньне і выхаваньне каапэрацыйных кіраўнікоў, умеючых правільна скарыстоўваць каапэрацыю для абслугоўваньня бядняцкіх і серадняцкіх мас пайшчыкаў, есьць неабходныя умовы для паступовага прасоўваньня каапэрацыі па сацыялістычнаму шляху.

„З дапамогай савецкай дзяржавы, з дапамогай буйнай сацыялістычнай прамысловасьці праз каапэрацыю да сацыялізму“.

Асноўная праца ЦКК-РСІ ў галіне каапэрацыі на 1927-1928 апэр. год

ЦКК-РСІ у сваім пляне бягучага году паставіла наступную працу ў галіне каапэрацыі:

1. *Вывучыць дзейнасьць і становішча малочнай каапэрацыі БССР* (праца ужо пачата) у напрамку: а) вывучэньня сеткі існуючых малочна-каапэрацыйных аб'яднаньняў, разьвіцьця малочнай каапэрацыі, дынамікі росту аб'яднаньняў і сяброў; яе ўдзельная вага ва усей сыстэме сельска-гаспадарчай каапэрацыі і сыстэме спэцыяльных відаў каапэрацыі, колькі двароў аб'яднана наўкол малочнай справы у арцелі, с.-гасп. таварыствы і калхозы, сацыяльны склад сяброў арцеляй па іх эканамічнай магутнасьці, выяўленьне раёнаў з найбольш і менш разьвітай малочнай каапэрацыяй;

б) Вывучэньня спосабаў рэалізацыі малочных прадуктаў і рынку збыту, як-та: колькасьць аб'яднаньняў, збываючых малако у цэлым выглядзе і перапрацоўваючых на масла, сыр, колькасьць зьбіраемага малака ад малочнай гаспадаркі сваіх членаў і пабочных здатчыкаў, наяўнасьць заводаў, іх абсталяваньне, нагрузка, забясьпечанасьць памяшканьнямі, захоўваньня прадуктаў і кваліфікаванай рабсілай, напаўненьня малочнымі прадуктамі рынку, удзельная вага малочнай каапэрацыі ва усей таварнай часьці малочнай прадукцыі сялянскіх гаспадарак БССР і малочным зварот арганізацыяў, якія забясьпечваюць насельніцтва малочнымі прадуктамі, малочная прадукцыя Белсельтрэсту, яе удзельная вага, цэны;

в) Ступені забясьпечанасьці малочна-каапэрацыйных аб'яднаньняў кармамі; выгляд кармоў, на якіх умовах і кім робіцца забясьпячэньне, парадак разьмеркаваньня і інш;

г) Арганізацыйна-вытворчага абслугоўваньня з боку сельска гаспадарчай каапэрацыі: спосабы абслугоўваньня, колькасны і якасны склад абслугоўваемага пэрсаналу, абслугоўваньне грашовае і інструкцыйнае, наколькі поўна ахапляецца абслугоўваньне, што мяшае разьвіцьцю малочнай сеткі, мерапрыемствы да пашырэньня сеткі малочных арцеляй далейшыя пэрспэктывы;

д) Грашовае становішча і справаздачнасьць памер сяброўскіх узносаў, крэдытаваньне малочнай каапэрацыі, становішча капіталаў, рэнтабельнасьць паасобных спосабаў рэалізацыі прадукцыі, сыстэма справаздачнасьці, і

е) Уплыў малочнай каапэрацыі на павышэньне прыбытковасьці сялянскіх гаспадарак; перамены у гаспадарцы з часу уступленьня у арцель і г. д.

2) *Вывучэньне і рацыяналізацыя апарату і сыстэмы саматужна-прамысловай каапэрацыі* у напрамку: рацыяналізацыі цэнтральнага апарату БКПС і паасобных зьвеньняў саматужна-прамысловай каапэрацыі і іх каапэрацыйнай працы (вытворчых, закупачна-збытавых і крэдытных функцыяў). Як праводзіцца арганізацыйнае і гаспадарчае абслугоўваньне нізавой сеткі, роля саматужна прамысловай каапэрацыі ў справе паднышэньня дабрабыту сялянства і насельніцтва мястэчак і іх калектывізацыі, роля саматужна-прамысловай каапэрацыі у вытворчасьці тавараў якіх нехапае, культ-праца саматужна-прамысловай каапэрацыі і праверка выкананьня пастаноў ураду і Рабкрыну па саматужна прамысловай каапэрацыі, ступень зьдзяйсьненьня прадстаўленых ёй ільгот.

3 Палепшаньне і спрашчэньне працы жыллёвай каапэрацыі ў напрамку вывучэньня структуры апарату, сеткі кіраўніцтва, гандлёвай і будаўнічай дзейнасьці, грашовага становішча і культурнай працы

4. *Вывучэньне дзейнасьці меліарацыйных і тарпяніковых таварыстваў.*

Па *меліарацыйным таварыствам* з пункту вывучэньня ролі меліарацыйных таварыстваў у культуры балот БССР, тэхнічнай і грашовай дапамогі з боку дзяржавы, сувязі агульнадзяржаўных работ з работамі меліарацыйных таварыстваў, эксплёатацыі меліарацыйных плошчаў і ўплыву Менскай балотнай станцыі на разьвіцьцё культуры балот.

Па *тарпяніковым таварыствам* вывучэньне на колькі сялянства ўжывае торф і парадак яго здабыцьця, тэхнічнай і грашовай дапамогі насельніцтву па вырабу торфу з боку дзяржавы і значэньне тарпяніковага вырабу ў зьмяншэньні крызісу апалу.

5 Праверка па паасобным працам, праведзеным у мінулым годзе і самае галоўнае вывучэньне вопыту рацыяналізацыі спажывецкай сыстэмы, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на выкананьне прынятых раней пастаноў аб пабудаваньні нізавой сеткі каапэрацыі, як першапачатковая сетка спажывецкай сыстэмы, сельска гаспадарчай, ЖАКТ'аў у жыльлёвай каапэрацыі і Кустпрамсаюзе. Праверка дасьць магчымасьць далейшай рацыяналізацыі, каапэрацыйнай тавараправодзячай сеткі і магчыма ліквідацыі лішніх зьвеньняў апарату. У шэрагу праверачных прац адно з самых асноўных гэта праверка таго, як каапэрацыя выконвае пастановы партыі.

Міх. Шмідт

Аб нашых задачах у рабселькораўскім руху

Пытаньне кіраўніцтва рабселькораўскім рухам, набывае ў сучасны момант асаблівае значэньне ў зьвязку з гаспадарчым ростам краіны, павышаньнем культурнага ўзроўню працоўных, росту актыўнасьці мас і г. д. Увага партыі рабселькораўскаму руху не павінна паслабляцца ні на адну хвіліну.

Калі мы прыкмячаем за апошні час, што паступленьне рабселькораўскага матар'ялу ў парыядычныя газэты амаль не ўзрастае, дык гэта толькі таму, што рабселькоры на мясцох не *сустракаюць* часам адпаведнага падтрыманьня з боку парт'ячэек, з боку прафсаюзаў, а пад час з боку тых ці іншых устаноў, кіраўнікі якіх не зьвяртаюць увагі на заметку рабселькора, зьмешчаную ў насьценгазэце ці ў парыядычным друку, ня гледзячы на тое, што гэтая заметка жыцьцевая, выкрывае шэраг недахопаў у тым ці іншым прадпрыемстве, установе і г. д.

Гэткае становішча мы наглядаем і ў адносінах дапамогі рабселькораўскім гурткам дзе рабселькор павінен вучыцца, як пісаць і аб чым пісаць.

Вось што піша ў газэту „Зьвязда“ селькор К.

„Наша камуністычная партыя прызнала рабселькораўскую арганізацыю аднэй з форм рабоча-сялянскае грамадзкасьці, якая знаходзіцца у самым шчыльным датычэньні з усімі галінамі штодзеннага палітычнага жыцьця і эканамічнага будаўніцтва краіны. Але яшчэ ня ўсюды зразумелі гэтую пастанову партыі, яшчэ ня ўсюды партарганізацыі кіруюць гэтым стыхійным рухам рабселькораў. Улетку ў нашым сельсавеце ня было ніякае працы з селькорамі. Мясцовая парт'ячэйка не зьвярнула на гэта увагі. Таксама ня было зусім ніякае працы ўлетку ў Лядненскім раене. Увесну гэтага году (17 красавіка) адбылася раённая канфэрэнцыя рабселькораў. У сваіх пастановах канфэрэнцыя адзначыла, каб часьцей праводзіліся сходы, нарады, ці канфэрэнцыі рабселькораў, але ня гледзячы на гэта з 17/IV 27 г. ня было ніводнага сходу. Селькоры ня мелі пэўнага напрамку ў сваёй летняй працы. Нам неабходна жывое кіраўніцтва. На гэта трэба зьвярнуць Лядненскаму райкому КПБ і належным установам увагу“.

Гэткіх фактаў мы маем вельмі шмат. Усе яны гавораць аб тым, што *ня досыць добра, ня досыць чула* партарганізацыі адносяцца да кіраўніцтва рабселькорамі, ня ўлічваючы важнасьці рабселькораўскага руху і важнасьці кіраўніцтва гэтым рухам з боку партыі.

Партыя павінна дапамагчы рабселькорам. Рабселькор павінен быць аўтарытэтным таварышом, яго заметка павінна карыстацца таксама аўтарытэтам і падтрыманьнем. Узмацніць і палепшыць работу рабселькораў, значыць, перш за усе лепш уявіць і ўсьвядоміць чарговыя задачы партыі і нашае ўлады, на падставе гэтых задач вызначыць свае задачы, паставіць іх перад сабою. У гэтым, у першую чаргу рабселькору павінна дапамагчы партыя.

Раённыя і акруговыя канфэрэнцыі рабселькораў, якія ў некаторых акругах ужо пачаліся, а ў некаторых яшчэ будуць праходзіць, павінны даць пачуць рабселькорам, што імі кіруе партыя і *што партыя на іх глядзіць, як на сваіх памоцнікаў, як на лепшых прадстаўнікоў на фабрыцы і ў вёсцы, якія дапамагаюць нам будаваць соцыялістычную гаспадарку.*

Тав. Сталін закранаючыся ролі рабселькораўскае арміі, гаворыць наступнае:

> „**Мы дайшлі да таго парыяду, калі адным з асноўных** падважнікаў у справе выпраўленьня нашае будаўнічае работы, у справе выяўленьне недахопаў, могуць стаць рабкоры і селькоры. **Мы, можа быць, ня ўсе гэта разумеем, але для мяне** зразумела, што з гэтага іменна канца павінна пачацца палепшаньне нашай працы. Гэтыя людзі ўражлівыя, гараць іскрай праўды, жадаюць выкрываць усе недахопы і часамі перагібаюць кій, жадаюць як-бы там ні было нашы недахопы выправіць. Людзі якія не баяцца куль. Вось гэтыя людзі, памойму, павінных складаць адзін з грунтоўных падважнікаў у справе высьвятленьня недахопаў і выпраўленьня нашай партыйнай **савецкай будаўнічай работы на мясцох**".

Паколькі гэта так, дык мы павінны сур'ёзна ўзяцца за дапамогу **рабселькорам**.

Канфэрэнцыі павінны даць штуршок да ажыўленьня працы. Тут трэба будзе ў першую чаргу абгаварыць пытаньні дню, якія нас зараз цікавяць. Узяць хоць-бы такія пытаньні, як калдагаворная кампанія, правядзеньне ў жыцьцё маніфэсту Сэсіі ЦВК СССР, Кастрычнікавы заклік у партыю. Гэта ж адны з галоўных пытаньняў дню рабкораў і селькораў, аб гэтым можна шмат пісаць, але-ж дагэтуль аб гэтым пішуць мала. Надыходзіць кампанія перавыбараў саветаў. Усе гэта моманты новыя.

Рэдакцыі акруговых газэт у гэтым павінны адыграць вялікую ролю. Кожная акруговая газэта павінна будзе абгаварыць разам з рабселькорамі паасобныя спэцыфічныя моманты сваей акругі, раёну, фабрыкі, заводу і нават вёскі, аб чым павінны будуць пісаць рабселькоры. **Вось важнае і каштоўнае ў рабоце рабселькораў.**

Нашы рабкоры і селькоры павінны умець своечасова рэагаваць на ўсе новыя моманты, яны павінны умець ісьці ў нагу з партыяй, яны павінны асьвятляць на старонках нашага пралетарскага друку ўсе тыя баявыя пытаньні, якія ставяцца партыяй і савецкай уладай.

Усе новае і жывое, якое адчуваецца ў нашай штодзеннай рабоце, павінна знайсьці поўны адбітак у дзейнасьці нашае рабкораўскае арміі.

Рабселькоры пасьля канфэрэнцыі павінны адчуць кіраўніцтва партыі, падтрыманьне партыйных ячэек, павінны адчуваць, што ім дапамагае **партыя ў іх рабоце.**

Добрае партыйнае кіраўніцтва рабселькорамі, рабселькоры адзначаюць, яны гэта адчуваюць. Вось характэрны ліст у рэдакцыю „Зьвязды **селькора Ц. (в. Бардзілаўка).**

> „Дзякуючы кіраўніцтву райкампартыі наш селькораўскі гурток мае вялікія дасягненьні. Гурток прыцягнуў увагу ўсіх сялян, завербаваў 212 падпішчыкаў на газэты, з ліку 512 сялянскіх двароў. За год праведзена 16 сходаў селькораў, 5 **агульных выездаў у другія вёскі**".

Было-б вельмі добра, калі-б такія лісты атрымліваліся ў большай колькасьці, чым раней паданы тут ліст. Але на вялікі жаль, пераважаючая **большасьць прыпадае толькі на першы ўзор лісту.**

Пытаньне выхаваньня рабселькора набывае ня менш важнае значаньне. Гэта—адно з чарговых пытаньняў партыі. Трэба пры кожнай рэдкалегіі арганізаваць гурток рабкораў, або селькораў, трэба узмацніць кіраўнікамі тыя гурткі, якія існуюць на паперы, а работы не праводзяць.

Рабселькораўскія гурткі не адчуваюць патрэбы ў вялікіх, не па сіле сродках, яны могуць абыйсьціся кожны гурток сумаю ў 3 р. 25 к., выпісаўшы часопіс „Рабоче-крестьянский корреспондент“ на цэлы год. Гэткую суму могуць выдаць усе гурткі. Мясцком, фабком і хата-чытальня ніколі не адмовяцца ад выпіскі такое часопісі.

Апошняя рабселькораўская нарада, якая адбылася у Маскве 28—30 лiпеня г. г. таксама адзначыла, што неабходна „дабіцца каб пры кожнай насьценгазэце быў створан гурток рабселькораў (сыстэматычныя сходы д пішчыкаў у насьценныя і перыядычныя газэты, а таксама і чытачоў“).

Зімні перыяд лепшы час для разгортваньня гэтае працы і прапусьціць яго нам нельга.

Толькі праз гурткі рабселькораў можна ажывіць насьценгазэту, палепшыць якасьць зьмешчанага у ей матар'ялу, а разам з гэтым больш падняць і аўтарытэт насьценгазэт.

Усе гэтыя мерапрыемствы не зьяўляюцца новымі. Аб іх шмат пісалася і гаварылася. *Трэба толькі памятаць важнасьць і карысьнасьць рабселькораўскай працы. Кожная партыйная ячэйка, кожны член партыі павінны гэта уявіць сабе, толькі такім чынам удасца выпішчыць усе недахопы у рабселькораўскай працы. А гэта адна з чарговых і неадкладных задач партыі.*

Зерницкий

Привлечение масс к работе Контрольных Комиссий

Успешность деятельности контрольных органов определяется степенью привлечения общественного внимания и втягивания в работу по улучшению аппарата и борьбу с бюрократизмом широких слоев рабочих, крестьян и служащих.

Итоговые данные за последний год показывают, что в этом направлении достигнуты дальнейшие улучшения в смысле установления при обследованиях большей связи с низовыми профорганизациями, соворгаами, парт'ячейками, производственными и экономкомиссиями, как путем вовлечения их в обследовательскую работу, так и путем постановки докладов перед ними о результатах обследований, также широкого освещения деятельности ЦКК-РКИ в печати.

Это видно из следующих фактических данных.

При проведении работ по упрощению советского аппарата выделенная с этой целью ЦКК-НКРКИ специальная группа вела свою работу в контакте с экономкомиссиями и ячейками учрежд (некоторые из них прорабатывали отдельные части программы непосредственно экономкомиссия НКФ, НКЗ, НКЮ и др., делались доклады на бюро и общих собраниях ячеек на экономкомиссиях и расширенных экономсовещаниях учреждений. Таких докладов работниками РКИ было сделано 45. Кроме того, членами ЦКК и членами коллегии НКРКИ делались доклады (27) на различных партийных и рабочих собраниях, на с'ездах, конференциях, горсоветах, окрисполкомах, а также в высших партийных, правительственных и профессиональных органах. Также широко было поставлено привлечение низовых профорганизаций к работе РКИ по упрощению хозяйственного аппарата (в Госторгбеле, Белавтопромторге, Центроспирте и др.).

Из отдельных работ, где была проведена значительная массовая работа, можно назвать—„Обследование безработицы, трудколлективов и общественных работ", во время которого было проведено 10 докладов и обслужено до 300 рабочих и членов партии.

В связи с работой по проверке выполнения директив по режиму экономии в отделении Лесбела и на заводе „Деревообделочник" было проведено 5 собраний (ячейки, производственной комиссии и собраний рабочих), как перед началом обследования, так и о его результатах.

При обследовании Центроспирта (проводилось в Минске, Витебске, Бобруйске и Гомеле) была установлена связь с профсоюзами, в ходе работ привлекались экономкомиссия аппарата районного управления центроспирта, производственные комиссии на 4-х предприятиях, ставились доклады на 4-х производственных совещаниях обследованных предприятий, а итоговый доклад был заслушан на расширенном заседании ЦП союза пищевиков.

При проведении обследования „Производительность труда и зарплата в предприятиях ВСНХ'а" на фабрике „Двина" (Витебск) был созван партактив фабрики, где был заслушан доклад дирекции „О состоянии производительности труда и зарплаты" с содокладом инспекторов. Кроме этого, во время обследования были созваны собрания рабкоров и стенкоров и членов КСМ на которых делалась информация об обследовании На заводе „Домбаль" и „Коминтерн" (Борисов), помимо информации об обследовании на бюро ячеек, заседаниях завкомов, ставились доклады зав. заводами с содокладами инспекторов на партактиве и производственных совещаниях Весьма активное участие принимали как члены партии, так и беспартийные рабочие в обсуждении поставленных перед ними вопросов. Собраниями отмечался „правильный метод работы РКИ в отношении теснейшей связи с массой рабочих и ознакомления и втягивания их в работу по обследованию". При обследовании Госкожзавода (Минск) принимали участие предфабкома и секретарь ячейки.

В обследовании тарифно-конфликтных комиссий и трудсессий принимали участие 4 фабзавкома предприятий и 2 месткома учреждений (Минск), а при обследовании работы примирительных комиссий при РИК'ах и трудсессии нарсудов принимали непосредственное участие представители райкомов профсоюза Рабземлес (2-х райкомов в Могилеве и 2-х в Минске); по вопросу о выполнении колдоговоров и задолженности по зарплате принимали участие ЦБ союзов строителей и бумажников, транспортных рабочих, кожевников, Медсантруд и Рабземлес.

Значительная работа по вовлечению широких масс была проведена во время проверки снижения цен к которой были широко привлечены лавочные и ревизионные комиссии, секции РКИ горсоветов и другие общественные организации. НК РКИ было проведено широкое совещание ревкомиссий центральных и других организаций гор. Минска по вопросам участия РК в работе по снижению цен и выработан ряд предложений в этом направлении.

В отдельных случаях созывались групповые собрания ячеек для обсуждения вопросов, относящихся к работе нескольких учреждений. Так, результаты обследования банковской системы были широко обсуждены на открытом групповом собрании ячеек банковских учреждений; результаты проверки использования целевых кредитов были обсуждены на групповом собрании ячеек.

Кроме того, практиковалось привлечение сов'ячеек и низовых профорганов на заседания ЦКК НКРКИ по вопросам работы их учреждений (предприятий), а также дача поручений по проверке и расследованию рабселькоровских корреспонденций (до 50 случаев поручений). В новом плане работы НКРКИ эта практика еще более усиляется В будущем году намечено привлечение сов'ячеек (и экономкомиссии) ревкомиссий и производственных комиссий к проверке выполнения директив ЦКК-РКИ и, в частности, путем выделения для них определенного числа тем проверочного характера.

В деревне, при проведении обследований, связь с массами достигалась путем докладов на крестьянских собраниях (обследование практики с.-х. налога, колхозов), на заседаниях пленумов сельсоветов и райисполкомов (обследование низового соваппарата) и привлечение к этой работе работников сельсоветов и РИК'ов. Но на этом участке связи с массами достижения пока незначительны.

Слабо еще привлечение *комсомольцев* к непосредственной практической работе РКИ—при обследованиях. Так, по всем КК комсомоль-

ские ячейки привлекались лишь в 28 случаях и то преимущественно по вопросам, связанным с работой комсомола (56 членов КСМ).

Также недостаточно привлечены *делегатские собрания женщин.* Практическое участие их пока насчитывается в единицах (единичные случаи привлечения к расследованию жалоб при бюро жалоб НКРКИ, по всем ОкК привлекалось к работе 9 делегаток и 42 женщины. Более систематическое участие делегаток достигается через секции РКИ при горсоветах, но работа их в секциях еще не обобщена).

Касаясь участия масс в работе контрольных органов, необходимо особо остановиться на деятельности *секции РКИ при горсоветах*, являющихся, как показал опыт, одной из лучших форм втягивания рабочих масс в борьбу с бюрократизмом и работу по улучшению госаппарата, и в общую работу КК-РКИ.

Секции РКИ организованы при всех горсоветах в окружных городах БССР. Из 6 [illegible] 375 чел. членов и кандидатов горсоветов и еще [illegible] прикрепленных для работы в этих секциях женщин-делегаток, в общем количестве членов секций 153 рабочих от станка, что составляет 40,8%. Секции РКИ занимались разносторонними вопросами, но наибольшее внимание уделяли вопросам, интересующим широкие рабочие массы, как, например, снижение цен (особенно широко провела эту работу секция РКИ Витебского горсовета), рационализация окружного соваппарата (Минск). Из таких же вопросов, занимающих значительное место в работе секций отметим обследования бирж труда, комтрестов (Минск и др.), жилтовариществ, столовок (Орша), состояния больниц, телефонного городского хозяйства, театров, т коллективов и т. д. Некоторые секции проводили работу по изучению таких специфических вопросов, как закрытие пивных на окраинах, около рабочих предприятий (Витебск), как ведется борьба с проституцией (Гомель) и т. п. вопросы.

Общий итог в отношении связи и привлечения массовых организации к работе КК-РКИ в Белоруссии выражается в следующих цифрах: *всего было привлечено к обследованиям ЦКК-НКРКИ 25 экономкомиссий (месткомов), 25 сов'ячеек. Производственных комиссий и совещаний (фабзавместкомов), а также парт ячеек привлечено было 10.* Из руководящих профорганов привлечено 10 ЦП союзов и их окружных отделений. Особо надо выделить, как наиболее систематическую связь с профсоюзом совторгслужащих. Наибольшая масса привлеченных к работе КК-РКИ падает на членов партии (75—80%), комсомольцев привлечено не больше 8—10%, и, как недостаток, нужно отметить еще очень слабое привлечение беспартийных, в особенности рабочих. В связи с тем, что в истекшем году проведена была большая работа по рационализации госаппарата, в числе привлеченных большое количество служащих и работников учреждений (до [illegible]). Привлечение крестьян пока еще почти отсутствует (до 25 случаев).

Докладов ЦКК-РКИ на массовых собраниях было сделано 192, из них на рабочих собраниях [illegible]%, на массовых собраниях служащих—до 11%, остальное число докладов на различных партсобраниях и конференциях. Вместе с числом докладов, проведенных окружными КК—*общее количество докладов органов КК-РКИ Белоруссии на массовых собраниях вырастает в довольно внушительную цифру—545.* Надо еще помимо сказанного здесь о массовой работе добавить, что *в центральных и окружных органах печати Белоруссии* за освещаемый период (с января до ноября) было *помещено более 430 различных печатных материалов* (в этом числе 211 руководящих информ. статей и фельетонов) о работе КК—РКИ.

Не останавливаясь на достигнутых результатах, ЦКК при намечении плана деятельности ЦКК—РКИ на 1927—1928 год приняла ряд положений в сторону дальнейшего усиления связи с массами.

Прежде всего принято за правило, что ни одна работа, сколько-нибудь имеющая существенное значение или интерес для определенной группы трудящихся, не может считаться законченной, если о ее результатах не будет сделано доклада и освещения в печати.

Должно быть усилено привлечение представителей ячеек ВЛКСМ, делегаток женотдела, рабселькоров, членов профкомиссий и производственных совещаний к отдельным вопросам работы КК—РКИ как путем включения их в число участников обследовательских комиссий, так и путем вопроса и бесед по вопросам обследования, совместной проработки выводов и предложений обследования с группами представителей, практиковать для этой цели работу во время свободное от работы привлеченного (в особенности рабочих).

При постановке докладов обратить особое внимание на увеличение докладов на массовых собраниях рабочих, крестьянских, на съездах и конференциях. В соответствии с директивой ЦК ВКП(б) контрольные комиссии должны принять меры к использованию материалов работы КК—РКИ в общей партийной агитации, привлекая к освещению вопросов деятельности КК—РКИ, помимо членов КК, также агитационные кадры парторганизации.

Необходимо усилить освещение в печати результатов и отдельных моментов обследований, в особенности освещения отдельных проявлений бюрократизма, волокиты и освещение результатов расследований по рабселькоровским заметкам, как в печати, так и на рабселькоровских совещаниях.

Секции РКИ при горсоветах должны быть шире привлечены к расследованию жалоб и заявлений об отдельных недочетах работы госаппарата. Целесообразным признано проведение открытого разбора отдельных жалоб на местах с привлечением к их разбору соответствующих организаций.

* *

В заключение нам кажется небезинтересным обратить также внимание на статью тов. Богданова („Большевик" № 18 за тек. г.), в которой выдвигаются некоторые новые моменты по вопросам привлечения масс к борьбе с бюрократизмом и работе по улучшению госаппарата.

Автор считает, что „при обследовании РКИ какого-либо треста, следует включить в комиссию, выделенную для этого обследования, *представителей рабочей массы, специально избираемых общим собранием рабочих*. При этом нарушится „конституция", сводящаяся к тому, что во всякие такие комиссии вводится специальный представитель организации, зачастую также оторванный и оторвавшийся от массы. Но если „конституция" нарушится — тем лучше. Я думаю, что уж действительно лучше демократия без „конституции", чем „конституция" без демократии".

Далее автор указывает „почему, скажем, не направиться сотням рядовых рабочих нескольких заводов в школы, чтобы обследовать состояние народного образования с тем, чтобы предложения этих рядовых рабочих действительно легли в основу действительных улучшений дела народного образования?"

В качестве еще одной новой формы в цитируемой статье выдвигается т. н. „советский день."

„У нас на каждом заводе есть партдень, профдень, день молодежи и проч. *Почему же не установить день в неделю или на первое время хотя бы в месяц для всех рядовых рабочих и организовать обмен мнениями о недостатках нашего госаппарата с тем, чтобы деловые предложения рабочих легли в основу действительных улучшений.* Каждый „советский день“ даст по всей СССР тысячи дельных и важных предложений рабочих об улучшении нашего госаппарата во всех его областях. Действительное осуществление этих предложений сблизит рабочие массы с госаппаратом“.

По нашему мнению эти предложения заслуживают безусловного внимания партийных организаций и контрольных органов. Надо пойти более решительно по пути дальнейшего втягивания рабочих масс в государственное строительство, в борьбу с бюрократизмом, за улучшение госаппарата.

НА МЯСЦОХ

Б. Шпітальнік

Вынікі вылучэньня і далейшыя задачы

(Мазырская акруга)

Пытаньню вылучэньня партыйных і беспартыйных рабочых і сялян на кіруючую працу займала ўвесь час шмат увагі партыйнай арганізацыі. Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 7 сакавіка 1927 г. адзначыў:

„Задача сапраўднага палепшаньня і прыбліжаньня к масам усёй сыстэмы кіраўніцтва, высунутая XIV Зьездам партыі і XV Партконфэрэнцыяй, можа быць разьвязана ў першую чаргу праз вылучэньне на сталую кіраўнічую працу ў дзяржаўны, гаспадарчы і кааперацыйны апарат зьвязаных з масамі лепшых рабочых (партыйных і беспартыйных) і найбольш блізкіх да савецкай улады перадавых сялян (партыйных і беспартыйных)“—(з рэзалюцыі ЦК УсеКП(б).

Гэтая задача, [illegible], атрымала свае практычнае праламленьне ў працы партыйнай акруговай арганізацыі як вылучэньнем, так і праверкаю працы з вылучэнцамі [illegible] сакратару Ахрпраўленьню [illegible] па пытаньням вылучэньня [illegible]

Праведзеная праца па вылучэньню характарызуецца наступнымі данымі:

Усяго вылучана	З іх па сацыяльнаму складу:					Па партыйнасьці		
	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	Беспарт.
129	[illegible]	3	[illegible]	[illegible]	29	86	6	37
	55%	2,4%	12,4%	7,7%	22,5%	66,7%	[illegible]	28,7

З усяго ліку вылучэнцаў жанчын 8, або 6,2%, з іх работніц 4, служачых—3, іншых—1.

З прыведзеных даных відаць, што пераважнае месца ва ўсім вылучэньні займаюць рабочыя (55%), пры чым з усяго ліку вылучаных рабочых, ад варштату займаюць 38%. Трэба адзначыць, што ня гледзячы на агульны рост і пашырэньне працы па вылучэньню, колькасьць неапраўдаўшых сябе на працы нязначная (з усяго ліку вылучэнцаў 13% былі зьняты з працы, з іх частка неапраўдаўшых сябе і частка якая адышла па свайму асабістаму жаданьню).

Да недахопаў у гэтай працы трэба аднесьці:

1) Нязначнае вылучэньне беспартыйных сялян беднякоў (усяго вылучана 12,4%), батракоў і сельска-гаспадарчых рабочых 2,4%) пры значным усё яшчэ вылучэньні за лік служачых (22,5%).

б) Слабае вылучэньне на розныя кіраўнічыя працы апраўдаўшых сябе на грамадзкай працы камсамольцаў.

в) Усё яшчэ невыстарчальнае вылучэньне на кіраўнічыя працы жанчын-работніц і сялянак (батрачак, беднячак і лепшых серадначак) грамадзяньніц.

Па нацыянальнасьці вылучэнцы разьмяркоўваюцца наступным парадкам:

Усяго вылучана	З іх: Беларус.	Яўрэяў	Расейц.	Іншых
129	75	40	7	7
	58%	31%	5,5%	5,5%

Такім чынам з гэтых даных відаць, што вылучэньне ішло пры правільных суадносінах асноўных нацыянальнасьцяў (беларусаў, яўрэяў, расейцаў і палякаў).

Вылучэнцы па галінам і маштабам работы разьмяркоўваюцца:

Галіны работы	Усяго вылуч.	З іх па маштабу работы: На цэнтр.	На акруг.	На раён.	На нізав.
Гаспадарч.	31	1	5	6	19
Прафэсыян.	46	—	10	23	13
Савецкая	23	2	4	12	5
Партыйная	6	—	—	6	—
Каапэрацыйн.	15	—	—	2	13
Культурн.	2	—	—	2	—
Камсамольск.	6	—	2	4	—

З гэтых даных відаць, што вылучэньне у асноўным ішло на лініі гаспадарчай (21[illegible]), прафэсыянальнай (35[illegible]) і савецкай (18[illegible]) пры значным ліку вылучэньня на акруговую і раённую працу.

Як недахопы неабходна адзначыць, — невыстарчальнае вылучэньне на каапэрацыйную работу наогул пры адсутнасьці вылучэньня зусім на акруговую каапэрацыйную работу.

Наогул у становішчы вылучэнцаў зжываюцца раней назіраўшыяся моманты нагорашаньня матэр'яльнага становішча вылучэнцаў (такія выпадкі яшчэ маюцца, але у меншай меры, чым яны былі раней); аддаецца большая увага з боку кіраўнікоў установаў да вылучэнцаў у сэнсе азнаямленьня іх з працай, аказаньня ім дапамогі у працы і г. д. Аднак, у працы з вылучэнцамі і наогул у практыцы самаго вылучэньня наглядаецца яшчэ цэлы шэраг недахопаў, галоўнымі з якіх зьяўляюцца:

а) Невыстарчальная разгорнутасьць сталай працы з вылучэнцамі, шляхам практыкаваньня перыядычных нарад у мэтах вырашэньня шэра-

гу пытаньняў, якія спрыялі-бы падняцьцю кваліфікацыі, сьвядомасьці і знаемства вылучэнцаў з працэсамі асобных галін працы.

б) І дасюгуль яшчэ бываюць моманты (праўда, гэта адзіныя выпадкі) няўважлівых адносін з боку некаторых кіраўнікоў установаў і прадпрыемстваў да вылучэнцаў у выглядзе нявыстарчальнага аказаньня ім дапамогі ў працы і перагрузкай іх рознымі (а часам і дробнымі) працамі, што не дае магчымасьці вылучэнцам кваліфікавацца і расьці на даручанай ім працы.

в) Слабая сувязь большай часткі вылучэнцаў з вылучаемай іх масай і ажыцьцяўленьне гэтай сувязі толькі ў часе праведзеньня справаздачных або выбарчых кампаній.

г) Бываюць выпадкі неразуменьня з боку некаторых кіраўнічых органаў тэхнікі вылучаньня і — каго трэба лічыць вылучэнцам, залічваючы ў вылучэнцы перасоўваньне работнікаў з ніжэйшых у вышэйшыя кваліфікацыі (рэгістратара ў машыністыя, ніжэйшага ў вышэйшага прыкавчыкі і г. д.).

д) Адсутнасьць адпаведнага ўліку як вылучэнцаў, так і актывістых, якія паступова могуць быць вылучаны на розную кіраўнічую працу.

Адзначаючы недахопы і вялікую важнасьць працы па вылучэньню рабочых, батракоў, лепшых беднякоў і сераднякоў на кіраўнічую працу, выплываецца перад намі шэраг задач па далейшаму працаваньню гэтай працы.

Асноўнай задачай у гэтым напрамку павінна быць усё большае узмацненьне працы па вылучэньню рабочых, батракоў і сельскагаспадарчых рабочых, сялян беднякоў і лепшых сераднякоў на адказную гаспадарчую, каапэрацыйную, савецкую, прафэсыянальную і іншую працу і ў даным выпадку, першачарговай задачай зьяўляецца загартаваньне мало-чагася актыву навокал партыі, Саветаў, каапэрацыі і т. д.

Аб гэтым досыць яскрава было адзначана ў рэзалюцыі пленуму Акруговага Камітэту КПБ (сакавік 1927 г.) па пытаньню аб унутрыпартыйным становішчы партыйнай арганізацыі „Асаблівую ўвагу звярнуць на ўзмацненьне апрацоўкі найбольш блізка стоячага да партыі вясковага актыву, выключна з батракоў і беднякоў, а таксама і сераднякоў, у поўнай меры праяўляючых адданасьць інтарэсам партыі“.

Неабходна таксама падняць яшчэ больш адказнасьць установаў асабліва кіраўнікоў устаноў і прадпрыемстваў за правільнае скарыстаньне вылучэнцаў, за поўнае аказаньне ім дапамогі і падтрымкі іх у працы.

Сухарев

Сов'ячейки в борьбе с бюрократизмом

(Бобруйск)

Бобруйский Окружком КПБ проверил выполнение директив советскими ячейками о работе по рационализации, борьбе с бюрократизмом и другими недостатками советского и хозяйственного аппарата. В результате выяснилась богатейшая картина этой работы.

Директивы ЦК ВКП о борьбе с бюрократизмом от 15-го ноября 1926 г. в советских ячейках обсуждались только в городе Бобруйске по предложению Горкома КПБ. В районах сов. ячейки этой директивы не прорабатывали. В сов. ячейках города Слуцка ставился специальный вопрос комиссией бывшего окружкома.

На оживление этой работы повлияла в некоторой степени газетная кампания в „Звезде“ которая пробудила инициативу отдельных партийцев и ячеек.

Вследствие отсутствия систематизированных практических указаний со стороны партийных комитетов особенно в районах, работа проводится отдельными членами партии, беспартийными работниками и организациями за редкими исключениями почти без всякого планового руководства со стороны советских ячеек. Поэтому эффект работы до сих пор недостаточный. Хотя в розницу (разрозненно) работа проводится большая, каждое учреждение может привести целый ряд примеров рационализации работы. Если и предусматривается, в части ячеек, в плане работы по рационализации, то ставятся слишком общие и трудно выполнимые задачи и в большинстве случаев не выполняются. В активную работу втянута только небольшая часть ячейкового партактива, остальные товарищи совершенно почти не участвуют в работе.

На собраниях ячеек ставятся, по преимуществу, обще отчетные доклады руководителей учреждений организации, выносятся резолюции, указывающие общее направление в работе, и мало уделяется внимания вопросам рационализации и борьбы с бюрократизмом. Специальные доклады о рационализации и отдельных отраслях работы учреждений, за редкими исключениями (ячейка админработников) не ставятся. Систематическая проверка выполнения директив и учет работы отсутствует или поставлен очень слабо.

На общих собраниях сотрудников отчетные доклады администрации, а тем более о рационализации аппарата ставятся совершенно недостаточно. Когда же такие доклады ставились, то давали самые положительные результаты в смысле сближения сотрудников с администрацией, улучшения работы и проведения намеченных мероприятий (ячейка админработников в Бобруйске и при Слуцком горсовете).

У отдельных администраторов партийцев есть недооценка роли профсоюза в деле воспитания сотрудников в духе труддисциплины. Один администратор, например, заявляет: „Экономкомиссия не должна тыкать

носа в вопрос поднятия дисциплины. т. к. профсоюз и поднятие дисциплины, как вода и огонь".

Большую роль выполняют стенгазеты в деле воспитания сотрудников и борьбы с бюрократизмом, там, где они систематически издаются (ячейка при Слуцком ЦРК и админработников в Бобруйске). Но стенгазеты в большинстве своем выходят нерегулярно, „по праздникам", а при отдельных сравнительно крупных учреждениях, даже вовсе отсутствуют (Слуцк).

Со стороны сов. ячеек отсутствует правильное партруководство стенгазетами и работа со стенкорами. Стенгазеты до сих пор даже не реорганизованы на основе последних решений ЦК ВКП о рабселькоровском движении. Стенкоры и вообще сотрудники сов. учреждений не достаточно освещают жизни своих учреждений и работу по рационализации и борьбе с бюрократизмом достижения и недостатки в окружной и центральных газетах.Ком'ячейки не проверяют заметки стенных и центральных газет.

В той работе ячеек, которая ими проводилась, первое место занимает поднятие трудовой дисциплины, сокращение штатов, борьба с бесхозяйственностью и растратами. В то же время недостаточно уделяется внимания упрощению отчетности (сокращение или упразднение отдельных анкет, ведомостей, книг и т. д.), устранению параллелизма в работе, канцелярской волокиты, борьбе с задолженностью, улучшению состава служащих, борьбе с протекционизмом и кумовством.

Упрощение отчетности проводится, главным образом, по инициативе центра. Один из администраторов Окрадмин отдела даже не мог себе представить, как можно в таком централизованном ведомстве ввести изменения отчетных и Совещание коммунистов все же это учредило и был составлен проект с об'яснительной запиской центру. Нововведение было санкционировано и применено в республиканском масштабе.

Товарищи из сов. ячеек обычно считают, что в их учреждениях параллелизма в работе и канцелярской волокиты, а также протекционизма и кумовства нет. Это лишь доказывает, что ячейки на эти стороны мало обращают внимания. Например, в Окрсельхозсоюзе была принята по протекции на работу счетоводом дочь крупного спекулянта. Об этом много говорили члены профсоюза, но ячейка ничего не предприняла. В Окрзо по протекции была принята на работу в библиотеку дочь бывшего предводителя дворянства и затем вступила в члены профсоюза, на это ячейка также не реагировала.

Отдельные комсомольцы принимают активное участие, но в целом ячейки недостаточно вовлекают комсомольскую массу в работу эконом. комиссии и совещаний. Вследствие малой квалификации комсомольцев и текучести состава затрудняется участие их в активной работе. Руководство парт'ячеек комсомолом в этой части недостаточное, поэтому, например, в Осиповичской ячейке КСМ была попытка специально выделенной комиссией произвести ревизию в райстрахкассе и финчасти РИК'а с целью установления фактов бюрократизма, помимо соответствующих органов. Отдельные комсомольцы недостаточно внимательно относятся к служебным обязанностям (ячейка при Слуцком ЦРК и админ отделе).

Вмешательства парт'ячеек в административно-распорядительскую работу не было. Между администрацией и парт'ячейкой в общем конфликтов на почве улучшения работы не бывает, за отдельными исключениями. Но тем не менее отношения нельзя считать вполне нормальными, так как большинство мероприятий администраторы-партийцы проводят кабинетным порядком без согласования с ячейкой в целом, а в

лучшем случае после переговоров с секретарем ячейки Из 4-х проверных ячеек только в одной (адмнработников № 1) администрация согласовывает свои нововведения. Если были случаи обхода администрацией этой ячейки, то ячейка у нее требовала исчерпывающих об'яснений

Подбор работников и выдвижение хотя бы внутри учреждения в большинстве случаев проходит помимо советских ячеек и месткомов. Администрация обычно согласовывает эти вопросы с райкомами (горкомом) обходя ячейку. Слабость связи администраторов-партийцев с ячейкой иногда усугубляется тем, что глава учреждения прикреплен к другой ячейке Таких случаев, правда, имеется немного. Рядовые партийцы, когда у них бывает какое-либо недоразумение по службе очень часто, минуя ячеику, обращаются непосредственно в райком или горком, а то и выше.

Администрация (напр в Слуцком ЦРК) зачастую не считается с указаниями отдельных партийцев, а тем более комсомольцев и беспартийных сотрудников, и ячейка в целом не ставила вопроса о призвании к порядку партийца (председателя ЦРК). Ввиду невыполнения администрацией решений ячейки, последняя перестала помогать администрации в ее работе, а отдельные партийцы даже впали в хвостизм, вместе с беспартийными иногда ноют по поводу тех или иных непорядков, а мер никаких не принимают.

Замалчивания недостатков со стороны других проверенных ячеек в целом, за исключением менее развитых и менее активных партийцев, нет.

На совещании актива советской ячейки в Осиповичах товарищи высказывались, что ответработники не терпят критики недостатков и деловых указаний Это отталкивает даже партийцев от борьбы с бюрократизмом вызывает пассивность. А с другой стороны, есть чрезмерная придирчивость к руководителям на недостатки.

Работа экономкомиссий и экономсовещаний в последнее время несколько оживилась, и имеются некоторые положительные результаты по изучению работы, выявлению инициативы и т д. Но эти достижения далеко недостаточны Заседания их созываются нерегулярно, выполнение планов недостаточное, вопросы прорабатываются поверхностно. Принципы НОТ при изучении отдельных вопросов нигде не применяются Когда говоришь о НОТ, товарищи принимают это, как пустое фантазерство. Тезисы к XV С'езду говорят прямо, что серьезная рационализация невозможна без самого широкого участия в этом науки Что это трудная штука, верно. Но дело в том, что мы более грубые и явно бьющие в глаза недостатки почти устранили, а дальше можно двигаться в основном путем коренной переделки системы работы. Скажут в ответ, что такие задачи—функции ЦКК-РКИ. Верно Но в то же время необходимо широкое участие партии и рабоче крестьянских масс в деле рационализации, а это возможно при их культурном росте. Но если оставить в стороне НОТ, то мало уделяется внимания мелочам повседневной работы.

Частая постановка вопросов сокращения штатов отталкивает сотрудников Совещания бывают с малым участием сотрудников (Слуцкая почта), а в некоторых учреждениях они вовсе не созываются (горсовет, отделение госбанка и милиция в Слуцке).

В экономсовещаниях коммунисты участвуют. Но коллективное правильное руководство комфракциями месткомов в этой части со стороны ком'ячеек отсутствует. Руководство по профлинии также недостаточное. Партруководство со стороны ячеек затрудняется иногда тем,

что в составе выборных профорганов, а также в экономкомиссиях отсутствуют партийцы и комсомольцы. Ячейка ОкРЗО к месткому „прикрепила“ партийца, но отчета его не ставила.

Экономкомиссии твердо не знают своих функций (Осиповичи и др.). Они иногда берут на себя функции администрации (м. к. при Окр. с.-х. союзе) и выносят решения „*предложить* администрации сделать то-то“. (почтово-телеграфная контора в Слуцке). Наоборот вследствие предрешенности вопросов в административном порядке убивается всякая инициатива сотрудников, а предложения на экономсовещаниях в таких случаях принимаются механически, в порядке информации. Есть случаи отказа администрации делать доклады на экономсовещаниях (Окрсельхозсоюз).

Институт парторгов по учреждениям в большинстве ячеек отсутствует, поэтому ячейки своей работой по рационализации и борьбе с бюрократизмом не охватывают все учреждения (яч. при Слуцком горсовете и окрсельхозсоюзе). Многие постановления ячеек носят общий характер и недостаточно конкретны. Это об'ясняется отчасти тем, что ячейки, обслуживая несколько учреждений, не знают их, и поэтому не охватывают их своей работой. Вследствие этого большое значение имеют совещания коммунистов по учреждениям; опыт работы этих совещаний себя вполне оправдал (яч. админработников).

Однако, вследствие отсутствия точно определенных партдиректив об этих совещаниях, в ячейках имеются неясности и поэтому совещания в некоторой степени затушевывают роль экономкомиссий и совещаний.

В некоторых районах (Бобруйском, Слуцком) отсутствует сов. ячейка, которая бы об'единяла партийцев РИК-а и др. районных учреждений и была бы ответственна перед райкомом за рационализацию, борьбу с бюрократизмом и др. недостатками. В других районах ячейки в райцентре существуют при местечковом или сельском совете, и поэтому ими почти совершенно не уделяется внимания борьбе с бюрократизмом в районных учреждениях, так как этими учреждениями руководят непосредственно райкомы, а последние не в состоянии уделять внимания мелочам повседневной работы районных учреждений. Райкомам надо больше привлекать ячейки, расположенные в райцентре, к работе по борьбе с бюрократизмом и рационализации аппарата.

Вследствие частых реорганизаций, которым подвергается советский и хозяйственный аппарат, и мероприятий по сокращению штатов, беспартийные сотрудники находятся под постоянной угрозой увольнения, поэтому у них есть боязнь „нагрубить начальству“, они открыто недостаточно высказывают известные им недостатки. Иногда сокращение проводится без надлежащего изучения нагрузки работников и необходимого проведения упрощения работы параллельно сокращению штатов, получается иногда прямой ущерб работе. Например, финчасти Осиповичского РИК'а сократили одного технического работника, а работу не сократили; в результате оставшийся аппарат не справляется с работой, в частности многочисленные жалобы крестьян на неправильное исчисление налога остаются долгое время нерассмотренными. Крестьяне в неведении, ворчат на райисполком. В общем, не продуманное и проведенное сплеча сокращение не привело к уменьшению бюрократизма, а его увеличило. Этот пример нам следует иметь в виду при работах по сокращению штатов не для того, чтобы отказаться от сокращения, а чтобы одновременно проводить упрощение работы.

Коммунисты иногда не являются примерными по службе для беспартийных. Случаи невнимательного отношения к работе отдельных

партийцев ячейки редко обсуждают, администрация не всегда ставит вопрос о подобных явлениях в ячейке. Ячейки должны требовать от партийцев и комсомольцев безусловно примерного отношения к служебным обязанностям, добросовестного и в срок выполнения поручений, своевременной явки на работу, не допускать отлучек с работы и т. д.

Все эти моменты, выявленные в результате изучения опыта работы, советским ячейкам и райкомам необходимо иметь в виду при дальнейшем развертывании работы по борьбе с бюрократизмом и прочими недостатками сов. аппарата.

Н. Разумоў

Правядзеньне беларусізацыі ў Залінейным раёне г. Гомелю

Раённая партыйная канфэрэнцыя падагульваючы працу ва ўсіх галінах партыйнага, прафэсыянальнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, прыдала максымум увагі камуністычнаму практычнаму правядзеньню беларусізацыі. У рэзалюцыі па справаздачы бюро Райкому гаворыцца: „Канфэрэнцыя адзначае, што у выніку правільнай лініі Райкому і правядзеньня здавальняючай выясьняльнай працы па пытаньням нацпалітыкі, маецца пералом у настроях партыйнае масы і рабочых у адносінах да практычнага правядзеньня беларусізацыі і даручае Райкому непаслабляць тэмпу працы у гэтай галіне". Першая палаза працы Райкому у галіне беларусізацыі была накіравана у бок шырокай выясьняльнай кампаніі перад усімі працоўнымі масамі дырэктыў партыі па пытаньням нацполітыкі і беларусізацыі, а затым мы прыступілі к вывучэньню беларускай мовы, укараненьню беларусізацыі па ўсім напрамкам. У сучасны момант на падставе падліку скарачаньня тэрмінаў па правядзеньню беларусізацыі у Гомельшчыне, мы накіравалі увагу ўсіх арганізацый на узмацненьне тэмпу беларусізацыі. Вагромная праца праведзена Аддзелам Асьветы па беларусізацыі школ і настаўніцтва. Перад пачаткам навучальнага году на прадпрыемствах праводзіліся разьясьняльныя гутаркі і даклады па орыентыровачнаму пляну беларусізацыі школ. Гэтае-ж пытаньне прапрацоўвалася і на сходах бацькоў. Такім чынам мы маем па раёну наступны малюнак:

На вучастках чыгункі, далучаных да БССР у гэтым годзе ва усіх лінейных школах у першых групах праца праводзіцца на беларускай мове, у іншых пачынаючы з трэцяе групы беларуская мова выкладаецца, як прадмет. З пяці дашкольных груп толькі дзьве расейскія, а рэшта— беларускія. Па лініі усіх установ профобра беларуская мова уведзена, як прадмет, таксама і у школах палітасьветы. Добра падобраны склад выкладчыкаў беларусаў; апроч таго перад пачаткам навучальнага году былі арганізаваны курсы па беларусазнаўству для 20 настаўнікаў. Асабліва востра стаіць пытаньне аб водпуску сродкаў на беларусізацыю. Другі год як накіроўваецца адпаведны каштарыс і у Саўнаркам БССР і, нарэшце, у сучасны момант пасланы каштарыс у НК шляхоў з хадайніцтвам аб водпуску крэдытаў на беларусізацыю. Праўленьне Заходніх чыгунак ня можа вылучыць крэдытаў на гэтую вельмі пільную патрэбу. Адсутнасьць асыгнаваньняў на беларусізацыю школ моцна перашкаджае гэтай справе.

Разгорнута вагромная праца па вывучэньню беларускае мовы сярод партарганізацыі. Поўнасьцю ахоплена вячэрняя савецкая партшкола, складаючаяся з 5 груп, ахоплена палітшкола II ступ. і частка палітшколы I ст. Робяцца заходы к поўнаму абслугоўваньню партыйнага актыву, але вялікая нагрузка працаю апошняга, зьяўляецца значнай перашкодай

у справе зьдзейсьненьня гэтай неадкладнай задачы. Мелі месца зрывы заняткаў дзякуючы вялікай нагрузцы партактыву.

Па лініі профсаюзаў таксама маецца вялікі зрух у гэтай галіне. Адбываюцца чытаньні на прадпрыемствах у абедзенныя перапынкі па пытаньням беларусізацыі, арганізавана 6 гурткоў па вывучэньню беларускае мовы сярод сяброў прафсаюзаў. Аднак, частка працоўнай масы да гэтага часу адносіцца да беларусізацыі бязудзельна. Паасобныя таварышы разважаюць яшчэ „няхай вывучаюць беларускую мову служачыя, а мы і так абыйдземся". Гэта кажа аб тым, што гэтая частка працоўных не ўявіла сабе сутнасьці пытаньню нацыянальнае палітыкі, што тут неабходна штодзённая, больш паглыбленая растлумачваючая праца, як па лініі прафсаюзных, так і партыйных арганізацый.

Вялікаю перашкодаю пры праводжаньні ў жыцьцё намечанага пляну беларусізацыі зьяўляецца адсутнасьць пэўнае колькасьці матэр'яльных сродкаў на аплату выкладчыкаў беларускае мовы, і ў першую чаргу па абслугоўваньню партыйных школ і гурткоў. У кантарысе па партасьвеце няма датацыі на вучэбныя гадзіны беларусазнаўства, па лініі наркамасьветы таксама не даюцца грошы для гэтай мэты. Неабходна Акрвыканкому і Акругкому заўважыць гэтае зьявішча і вынайсьці сродкі, каб палепшыць бесперабойны ход працы беларусізаваньня па ўсім лініям. Бо ўсякае замаруджваньне можа вытлумачвацца, як ухіл у бок паслабленьня самой беларусізацыі. Усприйманьне-ж разам сумесна са ўсімі нацыянальнага усьведамленьня, карысна для кожнага, самім жыцьцём вымагаецца усюды вывучэньне белмовы, сталае і неадкладнае.

Партыйным і прафсаюзным арганізацыям неабходна з асабліваю ўвагаю і чуласьцю падыходзіць да усіх мерапрыемстваў у галіне выкананьня парт-дырактыў вышэйстаячых партворганаў па пытаньню беларусізацыі, забясьпечваючы бесперабойную працу кожнага гуртка, кожнай групы рабочых і служачых. Адначасна з разгортваньнем працы новых гурткоў нам трэба тэрмінова налегчы на ўкараненьне элемэнтаў беларусазнаўства ў клюбах і ленінскіх кутках. Самым хворым месцам нашай працы тут зьяўляецца слабае распаўсюджаньне беларускага друку. Нават сярод партарганізацыі няма належнае увагі к падпісцы на цэнтральны ворган нашае партыі „Зьвязда", а ужо-ж газэта ня кажучы аб тым, што яна дае кіруючыя матэр'ялы па усім галінам партыйнага і гаспадарчага будаўніцтва, яна служыць таксама магутнаю прыладаю у справе вывучэньня беларускай мовы. Трэба дабіцца пералому і ў гэтай частцы.

Усе гэтыя пытаньні прадугледжаны нашым плянам па практычнаму праводжаньню беларусізацыі ў раёне. Неабходна, каб у гэты зімовы перыяд уся наша праца праходзіла пад лёзунгам яшчэ большага узмацненьня якасьці гэтае працы і узмацненьня тэмпу беларусізацыі.

Тэзісы тав. Хацкевіча па дакладу аб беларусізацыі на прэзыдыуме Савету Нацыянальнасьцяй ЦВК СССР

(7 кастрычніка 1927 г.)

1) Царская палітыка ў Беларусі пакінула у спадчыну гаспадарчы і культурны заняпад. Гэты заняпад абумоўліваўся асаблівай палітыкай царскага ураду, як у адносінах эканомікі, так і у адносінах культуры Беларусі. Імпэрыялістычная і грамадзянская войны, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі і звязаныя з імі акупацыі (нямецкая і польская), і бандытызм паглыбілі гэтую адсталасьць.

У моц тых-жа гістарычных умоў і царскай палітыкі ў Беларусі асталіся нацыянальныя супярэчнасьці, якія заключаюцца у тым, што нацыянальныя і сацыяльныя адзнакі цесна пераплятаюцца, стварыўшы становішча, пры якім развіваліся нацыяналістычныя забабоны, адасобленасьць і варожасьць паміж горадам і вёскай (русыфікацыя працоўнага насельніцтва гарадоў), у той час, як вёска заставалася у масе беларускай.

2) Ня гледзячы на шматвяковы нацыянальны ўціск беларускага народу спачатку Польшчай, а затым б. Расійскай Імпэрыяй, праследаваньне беларускай культуры, забарона карыстацца беларускай мовай, працоўныя масы Беларусі, асабліва працоўнае сялянства, захавалі да моманту рашучай барацьбы за сваё вызваленьне, г. зн. к моманту Кастрычнікавай рэвалюцыі—сваю мову, быт і культуру.

Дзякуючы перамозе Кастрычнікавай рэвалюцыі Беларусь атрымала поўную магчымасьць ня толькі культурнага разьвіцьця, але і дзяржаўную самастойнасьць.

3) У мэтах умацаваньня кіруючай ролі рабочае клясы, узьняцьця актыўнасьці і уцягненьня шырокіх мас працоўных у палітычнае, культурнае і гаспадарчае будаўніцтва, а таксама у мэтах кіраўніцтва культурным будаўніцтвам і разьвіцьцём нацыянальнай культуры, перад партыяй і Савецкай уладай паўстала задача: прыстасаваць дзяржаўны апарат, школы, мастацтва, літаратуру да абслугоўваньня асноўнай масы насельніцтва на яго роднай беларускай мове.

4) У пачатку правядзеньня беларусізацыі давялося сустрэнуцца з адсутнасьцю шырокага актыву, граматнага на беларускай мове, з русыфікатарскімі тэндэнцыямі сярод гарадзкой часткі насельніцтва асабліва сярод бышага чыноўніцтва, якія адносіліся да беларускай мовы, як да мовы выдуманай, з русыфікацыяй сельскага насельніцтва праз расійскую школу і казармы. Гэтыя прычыны зьяўляліся галоўнейшымі перашкодамі ў практычным правядзеньні беларусізацыі.

5) Актыўная і пляновая праца па правядзеньні беларусізацыі, паступова разгортваючыся, пачалася пасьля другой Сэсіі ЦВК БССР у 1924 г. Гэтай Сэсіяй быў прыняты плян практычных мерапрыемстваў па правядзеньні нацыянальнай палітыкі і ўстаноўлены дакладныя тэр-

міны пераходу дзяржаўных і грамадзкіх апаратаў, так і працы культурна-асьветных установ на беларускую мову.

6) а) Пры практычным ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі была зьвернута сур'ёзная увага на пастаноўку і разгортваньне растлумачальнай працы сярод работнікаў савецкіх і грамадзкіх установ і арганізацый і на прыцягненьне да гэтае справы партыйнай і савецкай грамадзкасьці, дзякуючы чаму адбыўся пералом у настроях гэтых работнікаў у бок станоўчых адносін да беларусізацыі

б) Шляхам арганізацыі курсаў і гурткоў па вывучэньню беларускай мовы, паступова падрыхтоўваўся кадр работнікаў, уладаючых беларускай мовай. Так у 1925 г. доля ўладаючых беларускай мовай у цэнтральных установах—21,[illegible]%, акруговых і раённых 36,2%, у 1926 г. у цэнтральных 54%, акруговых і раённых 42%; у 1927 г. у цэнтральных—80%, акруговых і раённых—70%.

в) Поўнасьцю беларусізаваны апараты цэнтральных і акруговых, раённых і сельскіх установ, якім быў дадзены 2-хгадовы тэрмін пераходу на беларускую мову; у значнай меры, у сярэднім на 70% беларусізаваны апараты усёй рэшты савецкіх установ, процантаў у сярэднім на 40 апараты гаспадарчых установ і на 50% беларусізаваны апараты каапэрацыйных арганізацый.

г) Слаба праводзіцца беларусізацыя апарату на чыгуначным транспарце, што тлумачыцца значным процантам працуючых на ім вялікарусаў, старога чыноўніцтва з рэшткамі русыфікатарства, якое праводзілася царызмам на транспорце асабліва ўзмоцнена.

7) У мэтах зьбліжэньня рабочае клясы з сялянствам і ўмацаваньня яго кіруючай ролі у саюзе з сялянствам, паўстала задача аб ліквідацыі беларускай няпісьменнасьці сярод рабочых беларусоў і аб вывучэньні беларускае мовы рабочымі ўсіх нацыянальнасьцяй, у першую чаргу яго актывам

Пры ажыцьцяўленьні гэтай задачы вялікай перашкодай зьяўляецца вялікая стракатасьць нацыянальнага складу профсаюзаў; тым ня менш маюцца значныя вынікі у гэтым кірунку, якія выражаюцца у пераломе настрою і у справе ўсваеньня рабочымі беларускай мовы Таксама прыстасаваны апараты профсаюзаў для абслугоўваньня мас на беларускай мове. Так апараты профсаюзаў Працасьветы і Рабземлес поўнасьцю праводзяць сваю працу на беларускай мове.

Апараты рэшты профсаюзаў беларусізаваны ў сярэднім на 50%.

8) Арганізаваныя у 1923 г. нацыянальныя беларускія часьці Чырвонай арміі (школа комскладу, дывізія і інш.) у значнай сваёй частцы беларусізаваны, як прыклад у вайсковай школе імя ЦВК БССР частка заняткаў праводзіцца на беларускай мове, у іншых часьцях палітычныя заняткі больш чым на палову праводзяцца на беларускай мове; выданы вайсковыя статуты на беларускай мове. Пры Інбелкульце спэцыяльнай камісіяй выпрацоўваецца вайсковая тэрміналёгія Пазашкольная праца ў большай частцы сваёй праведзена на беларускую мову.

9) Ня гледзячы на нізкі культурны узровень карэннага беларускага насельніцтва, малы лік пралетарскіх кадраў і шэраг іншых аб'ектыўных прычын, БССР дасягнула значных вынікаў у справе карэнізацыі апарату, якія ў асноўным зводзяцца да наступнага:

а) сыстэматычна павялічваецца процант уцягненьня у кіруючыя партыйныя, савецкія, грамадзкія органы работнікаў з асноўных нацыянальнасьцяй,

а) павялічваецца колькасны і якасны рост пралетарыяту за кошт карэннага насельніцтва, як важнейшая база для далейшага ажыцьцяўленьня карэнізацыі;

в) назіраецца значны рост актыўнасьці шырокіх пластоў працоўных усіх нацыянальнасьцяй (вылучэньне) у справе удзелу у савецкім і грамадзкім будаўніцтве;

г) апарат савецкіх грамадзкіх арганізацый цалкам прыстасаваны для поўнага абслугоўваньня усіх нацыянальнасьцяй БССР на іх роднай мове.

10) У Беларусі, як у адсталым краі працоўныя жанчыны, сялянкі у асаблівасьці, будучы амаль няпісьменнымі, прымалі слабы удзел у будаўніцтве палітычнага і грамадзкага жыцьця. Толькі апошнія тры чатыры гады, дзякуючы вялізнай палітыка асьветнай працы ня гледзячы на груднасьці, работніцы і сялянкі, ў большай масе удзельнічаюць у савецкім будаўніцтве, застаючыся на практычнай кіруючай працы ва усіх савецкіх і грамадзкіх органах, аж да цэнтральных.

11) Пашырэньне тэрыторыі БССР шляхам далучэньня да яе частак быўшых губ. Віцебскай, Гомельскай і часткі Смаленскай значна узмацнілі эканамічнае і палітычнае становішча краю і тэтым самым далі магчымасьць пашырэньню культурнага будаўніцтва у адносінах усіх нацыянальнасьцяй БССР.

12) У галіне практычнага правядзеньня нацыянальнай палітыкі асаблівае значэньне набывае праца Народнага Камісарыяту Асьветы па культурнаму будаўніцтву БССР. Да рэвалюцыі на Беларусі ня было ніводнае вышэйшай навучальнай установы мала было сярэдніх школ, пачатковыя школы разам з царкоўна-прыходзкімі абхоплівалі 43% дзяцей ад 8 да 12 год; у сучасны момант Беларуская Рэспубліка мае 4 ВНУ, 2 вышэйшых навукова-дасьледчых установы, 30 тэхнікумаў і сетку прафэсыянальна-тэхнічных школ, палітыка-асьветных і дашкольных установ, праводзіцца плян увядзеньня усеагульнага абавязковага навучаньня, што дала магчымасьць давесьці процант абхопу дзяцей пачатковай 4-х гадовай школай у 1926-27 навучальным годзе да 72,7%, даушы такім чынам павялічэньне, у параўнаньні з 1913 г., на 28,8%.

13) Беларуская літаратура і мастацтва, якія знаходзіліся да рэволюцыі ў стане уціску, атрымалі магчымасьць выявіцца і разьвіцца у поўным аб'ёме і знайсьці шырокае распаўсюджваньне сярод шырокіх рабоча-сялянскіх мас Беларусі. У БССР у сучасны момант, аднача сна з поэтамі адзінкамі, выхаванымі ва умовах дарэволюцыйнай Расіі, працуюць дзьве арганізацыі пісьменьнікаў, згрупаваўшыя вакол сябе маладых поэтаў і пісьменьнікаў.

Друкаванае слова на беларускай мове распаўсюджваецца ў вялікай колькасьці выданьняў і экзэмпляраў. Выдаецца 3 цэнтральных газэты на беларускай мове, шэраг акруговых газэт, цэлы шэраг часопісяй, кніг, навуковых прац. Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва сваю продукцыю на беларускай мове на 1927-28 навучальны год вызначае ў 930 друкаваных аркушаў.

Распрацоўваецца беларуская песьня і музыка, працуе 4 дзяржаўных тэатры.

14) Існуючая культурна-асьветная сетка не магла быць адразу і поўнасьцю беларусізавана ў моц гістарычнага становішча беларускага народу (адсутнасьць выстарчальных кадраў беларускай інтэлігенцыі, слабасьць літаратурнай спадчыны і інш.) і процант беларусізацыі па асобным відам культасьветных установ к пачатку 27-28 г. выражаецца ў наступным выглядзе:

а) школы соцыяльнага выхаваньня беларусізаваны на 100% (апрача Гомельшчыны)

б) тэхнікумы 63,2%

в) профшколы 60,2%

г) ВНУ 17,5%
д) школы па ліквідацыі няпісьменнасьці . . 100%
е) хаты-чытальні 100%

15) Пры правядзеньні нацыянальнай палітыкі у культурна-асьветных установах, Беларускі Урад кіраваўся наступнымі прынцыпамі

а) установы соцыяльнага выхаваньня і палітыка-асьветныя павінны працаваць на роднай мове;

б) тэхнікумы і ВНУ павінны выпускаць работнікаў, прыстасаваных для абслугоўваньня насельніцтва на его роднай мове;

в) расійскія і беларуская мовы зьяўляюцца абавязковымі ва ўсіх навучальных установах, незалежна ад таго, на якой мове школа працуе; першая як мова саюзнага значаньня, другая як мова большасьці насельніцтва БССР.

16) Пры правядзеньні беларусізацыі асаблівая увага была зьвернута на забесьпячэньне культурных патрэбнасьцяй нацыянальных меншасьцяй БССР Колькасьць школ на нацыянальных мовах наогул прапорцыянальна адпавядае колькасьці насельніцтва гэтых нацыянальнасьцяй Слаба разьвітая сетка расійскіх 4-х гадовых школ тлумачыцца тым, што расійскае насельніцтва у сельскіх мясцовасьцях БССР жыве невялікімі групамі і ўкраплена у асноўныя масы беларускага насельніцтва; што датычыцца гарадоў, то яны забясьпечваюць дзяцей расійскай нацыянальнасьці 7-х гадовымі школамі у большай меры, чым беларускія школы. Неадпаведнасьць школ на яўрэйскай мове з колькасьцю яўрэйскага насельніцтва тлумачыцца нежаданьнем дробна-буржуазнай часткі яўрэйскага насельніцтва навучаць сваіх дзяцей у яўрэйскіх школах

17) Рознастайная ступень культурнасьці насельніцтва розных нацыянальнасьцяй БССР робіць няроўнамерным процант забесьпячэньня школай дзяцей розных нацыяльнасьцяй.

У 1926-27 навучальным годзе абслугоўвалася 4-х гадовай пачатковай школай, незалежна ад мовы выкладаньня:

беларусоў	63%
яўрэяў	72,8%
палякаў	90,7%
расійцаў	85%
іншых	64%

Другім концэнтрам 7-годкі:

беларусоў	8,2%
яўрэяў	37,5%
палякаў	8 4%
расійцаў	11%

18) Пры практычным правядзеньні нацпалітыкі асаблівае месца ў БССР займае Інстытут Беларускай Культуры За кароткі час свайго існаваньня ён разьвінуў вялікую навукова дасьледчую працу ў галіне вывучэньня беларускай мовы, устанаўленьня беларускай тэрміналегіі, распрацоўкі пытаньняў беларускай гісторыі, географіі і асаблівасьцяй беларускага краю Пры Інбелкульце маюцца аддзелы: яўрэйскі, польскі, літоўскі, латыскі

У сваім далейшым разьвіцьці Інстытут Беларускай Культуры мяркуецца рэорганізаваць у Беларускую Акадэмію Навук.

19) У справе ажыцьцяўленьня нацпалітыкі адыгралі значную ролю нацкамісіі цэнтральная і акруговыя Іх роля асабліва была значнай пры правядзеньні праверкі ажыццяўленьня пастаноў Ураду па нацпытаньню, пры праверцы веданьня беларускае мовы супрацоўнікамі ўстаноў, пры вывучэньні нацпытаньня і распрацоўцы практычных мерапрыемстваў у гэтай галіне і дачы практычных указаньняў савецкім і грамадзкім установам па ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі.

20) Саветы ў БССР (сельскія, мястэчковыя, гарадзкія) пачалі арганізоўвацца ў пэрыод наступленьня белапалякаў, шырока разьвінутага бандытызму і праца іх у той час зводзілася да садзейнічаньня і арга-

нізацыі барацьбы за вызваленьне, за умацаваньне дыктатуры пралетарыяту.

За апошнія гады Саветы у БССР арганізацыйна ўзмацніліся, адміністрацыйна-гаспадарчая і культурна-грамадзкая праца іх значна павялічылася. Расьце вакол саветау рабоча-сялянскі актыў. Так па даным за 1926 г. у камісіях пры сельскіх і местачковых саветах працавала 19.286 працоўных, з якіх 41%—не члены саветаў.

Гэтаму дапамагала, апрача іншых спрыяючых умоў мірнага будаўніцтва, раёнаваньне і пашырэньне правоў саветаў.

21) Для найбольшага абслугоуваньня працоўных мас нацменшасьцяй арганізавана 55 нацсаветау. Нацсаветы створаны па нацыянальнаму і тэрыторыяльнаму прынцыпам ва ўсіх мясцох, дзе найбольш кампактна жыве насельніцтва нацменшасьцяй. Яны абслугоуваюць 69.945 (сюды не ўвайшло насельніцтва 3 нацсаветау Гомельскай акругі) чалавек нацменшасьцяй. Нацсаветы разьмяркоуваюцца: яурэйскіх 21, польскіх 23, нямецкіх 2, латыскіх 5, вялікарускіх 2, зьмешаных (беларуска-яурэйскіх) 2.

Нацсаветы значна садзейнічалі большаму ўздыму палітычнай актыўнасьці працоўных мас нацменшасьцяй, арганізацыі грамадзкасьці культурнаму разьвіцьцю і уздыму гаспадаркі. Яны стварылі умовы разрыву адзінага нацыянальнага фронту для правядзеньня клясавай дыфэрэнцыяцыі і палітычнай сьвядомасьці беднаты і гэтым сябе палітычна і практычна цалкам апраўдваюць.

22) Правільнае правядзеньне беларусізацыі і карэнізацыі пры адначасовай стараннай увазе да фактычнага забесьпячаньня патрэб і запатрабаваньняў працоўных нацменшасьцяй стварылі тую базу, на якой зжываюцца гістарычна склаўшыяся нацыянальныя забабоны, розьнь, абасобленнасьць. Гэтыя мерапрыемствы зьявіліся рашаючым фактарам ў справе зблізкаваньня працоўных усіх нацыянальнасьцяй і выкоуваньня іх клясавай адзінасьці, разьбіваючы імкненьне буржуазных элемэнтаў павесьці за сабой працоўных пад сваім лёзунгам—„нацыянальнага адзінства“.

Актыўнае правядзеньне нацпалітыкі ў галіне беларусізацыі адбілася і на настроях часткі інтэлігенцыі нацменшасьцяй (яурэйскай, польскай і інш.), расцэньваючых нацпалітыку Савецкай Улады, як палітыку „абеларушваньня“ і няўважлівасьці да інтарэсаў і запатрабаваньняў іншых нацыянальнасьцяй.

Правільнае практычнае правядзеньне нацпалітыкі, барацьба з усякага роду ўхіламі і скажэньнямі нацпалітыкі недапусьціла да разьвіцьця з аднаго боку актыўнага наступальнага беларускага нацыяналізму, з другога боку —імкненьне нацменшасьцяй замкнуцца у рамкі сваёй нацкультуры, у баку ад савецкага будаўніцтва ў БССР.

Поруч з дасягненьнем у працы па беларусізацыі, есьць шэраг труднасьцяй і недахопаў, галоўнымі з іх зьяуляюцца:

1. Рэшткі фармальных адносін да беларусізацыі з боку часткі работнікаў некаторых установу. Гэтая акалічнасьць паглыбляецца яшчэ і тым, што некаторыя нават кіруючыя работнікі няўжываюць ніякіх мер да барацьбы з гэтым фармалізмам.

2. Вялікадзяржаўны, вялікарускі шавінізм, як спадчына царызму, які гнязьдзіцца сярод часткі русыфікаванай інтэлігенцыі, галоўным чынам былага чыноўніцтва, а таксама сярод гарадзкіх дробна-буржуазных элемэнтаў.

3. Мясцовы беларускі шавінізм і „нацыянальна-дэмократычныя“ настроі, якія назіраюцца ў кулацкім пласьце вескі і у некаторай частцы беларускай інтэлігенцыі, як выказьніцы гэтых настрояў.

4 Недахоп падручнікаў і наогул навучальнай літаратуры спацыяльна прыстасаванай для навучаньня дарослага насельніцтва беларускай мове

5 Нездавальняючая арганізацыя вывучаньня беларускай мовы рабочымі, што зьяўляецца тормазам у вылучэньні новых пралятарскіх кадраў для савецкага і культурнага будаўніцтва.

6. Нявыстарчальна разьвітая сетка школ па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дарослага беларускага насельніцтва.

7 Абмежаванасьць масавай літаратуры для рабочых і сялян на беларускай мове і яе дарагоўля.

8 Нявыстарчальнасьць кадраў шырокага актыву пісьменнага на беларускай мове і яго параўнаўчая моладасьць.

Наша далейшая праца па беларусізацыі павінна заключацца, перш за усе, ва ухіленьні труднасьцяй і зжываньні памяненых недахопаў.

Адказны рэдактар *М. Галадзед*

Члены рэдкалегіі *А. Сянькевіч*, *Рыжоў*, *Гоузман*

ЗЬМЕСТ

НА МЯСЦОХ

АД РЭДАКЦЫІ

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ“

Рэдакцыя **„Бальшавік Беларусі“** заключыла ўмову з Менскай п/т канторай аб прыйманьні падпіскі на **„Бальшавік Беларусі“**, а таксама распаусюджваньня **„Бальш. Белар.“** ўсімі паштова-тэлеграфнымі Канторамі БССР

З 1 студзеня 1928 г, падпіска на часопісь **„Бальшавік Беларусі“** будзе прыймацца ўсімі паштова-тэлеграфнымі канторамі БССР.

Прынятая паштова-тэлеграфнымі канторамі падпісная плата на **„Бальшавік Беларусі“** будзе перасылацца ў Менск за кошт гэтых кантор.

Усе пасьведчаньні выданыя канторай **„Зьвязда“** сваім агэнтам адносна прыйманьня падпіскі на **„Бальшавік Беларусі“** з 1 студзеня 1928 году лічуцца анулюванымі. Тыя агэнты па падпісцы, якія хочуць зьбіраць падпіску на **„Бальшавік Беларусі“** павінны атрымаць на гэта адпаведнае пасьведчаньне ад рэдакцыі **„Бальшавіка Беларусі“**.